# ПАВЕТРАНЫ КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
16 мая 2006 г. № 117-З

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 3 красавіка 2006 года*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 24 красавіка 2006 года*

Змяненні і дапаўненні:

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 г. № 300-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 305, 2/1397) <H10700300>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 г. № 301-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 305, 2/1398) <H10700301>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 21 ліпеня 2008 г. № 419-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 184, 2/1516) <H10800419>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 г. № 109-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 17, 2/1661) <H11000109>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 мая 2011 г. № 266-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 60, 2/1818) <H11100266>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 ліпеня 2012 г. № 426-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 26.07.2012, 2/1978) <H11200426>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2014 г. № 127-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 17.01.2014, 2/2125) <H11400127>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 2015 г. № 242-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 22.01.2015, 2/2240) <H11500242>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 21 кастрычніка 2016 г. № 435-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 28.10.2016, 2/2433) <H11600435>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 24 кастрычніка 2016 г. № 437-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 29.10.2016, 2/2435) <H11600437>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 чэрвеня 2018 г. № 112-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 22.06.2018, 2/2550) <H11800112>

Кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2023 г. № 289-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 22.07.2023, 2/3009);

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2024 г. № 346-З (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 10.01.2024, 2/3066)

## ЗМЕСТ

ГЛАВА 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 1. Асноўныя тэрміны і іх азначэнні, якія прымяняюцца ў гэтым Кодэксе

Артыкул 2. Суверэнітэт у адносінах да паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 3. Сфера дзеяння гэтага Кодэкса
Артыкул 4. Прававое рэгуляванне адносін у галіне выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь і авіяцыі
Артыкул 5. Правілы выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 6. Авіяцыйныя правілы
Артыкул 7. Адказнасць за парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне выкарыстання паветранай прасторы і авіяцыі
ГЛАВА 2. ДЗЯРЖАЎНАЕ РЭГУЛЯВАННЕ ВЫКАРЫСТАННЯ ПАВЕТРАНАЙ ПРАСТОРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Артыкул 8. Дзяржаўнае рэгуляванне выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 9. Дзяржаўныя прыярытэты ў выкарыстанні паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 10. Арганізацыя выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 11. Структура паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 12. Класіфікацыя паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 13. Дазвол на выкарыстанне паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 14. Забарона або абмежаванне выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 15. Кантроль за выкананнем Правілаў выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 16. Аэранавігацыйнае абслугоўванне палётаў паветраных суднаў
Артыкул 16[1]. Метэаралагічнае забеспячэнне
ГЛАВА 3. ДЗЯРЖАЎНАЕ РЭГУЛЯВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ Ў ГАЛІНЕ АВІЯЦЫІ
Артыкул 17. Віды авіяцыі Рэспублікі Беларусь
Артыкул 18. Дзяржаўнае рэгуляванне дзейнасці ў галіне авіяцыі
Артыкул 19. Выключаны
Артыкул 20. Сертыфікацыя ў галіне грамадзянскай і эксперыментальнай авіяцыі
Артыкул 21. Дзяржаўная падтрымка развіцця авіяцыі
Артыкул 22. Кантроль у галіне авіяцыі
ГЛАВА 4. ПАВЕТРАНЫЯ СУДНЫ, ГРАМАДЗЯНСКІЯ БЕСПІЛОТНЫЯ ЛЯТАЛЬНЫЯ АПАРАТЫ
Артыкул 23. Патрабаванні да лётнай прыдатнасці паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў
Артыкул 24. Сертыфікат эксплуатанта паветранага судна, сертыфікат эксплуатанта грамадзянскага беспілотнага паветранага судна
Артыкул 25. Сертыфікацыя грамадзянскіх і эксперыментальных паветраных суднаў, беспілотных авіяцыйных комплексаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў
Артыкул 26. Падтрыманне лётнай прыдатнасці грамадзянскіх і эксперыментальных паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў
Артыкул 27. Прызнанне сертыфіката тыпу і экспартнага сертыфіката лётнай прыдатнасці паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў замежнай дзяржавы
Артыкул 28. Выключаны
Артыкул 29. Дзяржаўная рэгістрацыя паветраных суднаў
Артыкул 29[1]. Дзяржаўны ўлік грамадзянскіх беспілотных лятальных апаратаў
Артыкул 30. Выключэнне паветранага судна з адпаведнага дзяржаўнага рэестра паветраных суднаў

Артыкул 31. Допуск паветраных суднаў да эксплуатацыі
Артыкул 32. Допуск дзяржаўнага паветранага судна да эксплуатацыі ў грамадзянскай авіяцыі
Артыкул 33. Знакі, якія наносяцца на паветраныя судны
Артыкул 34. Пазыўны радыёсігнал грамадзянскага паветранага судна
Артыкул 35. Абмежаванне права карыстання грамадзянскімі паветранымі суднамі
ГЛАВА 5. АВІЯЦЫЙНЫ ПЕРСАНАЛ
Артыкул 36. Агульныя палажэнні аб авіяцыйным персанале
Артыкул 37. Сертыфікацыя ўзроўню кампетэнтнасці авіяцыйнага персаналу грамадзянскай авіяцыі
Артыкул 38. Падрыхтоўка, перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі авіяцыйнага персаналу грамадзянскай авіяцыі
Артыкул 38[1]. Медыцынскае забеспячэнне палётаў
ГЛАВА 6. ЭКІПАЖ ПАВЕТРАНАГА СУДНА, АПЕРАТАР БЕСПІЛОТНАГА ЛЯТАЛЬНАГА АПАРАТА
Артыкул 39. Састаў экіпажа паветранага судна
Артыкул 40. Права члена экіпажа грамадзянскага паветранага судна, грамадзянскага беспілотнага паветранага судна на адмову ад выканання палёту
Артыкул 41. Пакрыццё шкоды члену экіпажа паветранага судна
Артыкул 42. Камандзір паветранага судна
Артыкул 42[1]. Аператар беспілотнага лятальнага апарата
Артыкул 43. Правы камандзіра паветранага судна
Артыкул 43[1]. Правы аператара беспілотнага лятальнага апарата
Артыкул 44. Дзеянні экіпажа паветранага судна, аператара беспілотнага лятальнага апарата ў выпадку небяспекі
ГЛАВА 7. АЭРАДРОМЫ (ВЕРТАДРОМЫ), ПАСАДАЧНЫЯ ПЛЯЦОЎКІ, АЭРАПОРТЫ І АБ'ЕКТЫ АДЗІНАЙ СІСТЭМЫ АРГАНІЗАЦЫІ ПАВЕТРАНАГА РУХУ
Артыкул 45. Аэрадромы (вертадромы) і пасадачныя пляцоўкі
Артыкул 46. Аэрапорты
Артыкул 47. Распрацоўка праектнай дакументацыі, узвядзенне, мадэрнізацыя і эксплуатацыя аэрадромаў (вертадромаў), аэрапортаў і аб'ектаў Адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху
Артыкул 48. Будаўніцтва, размяшчэнне і эксплуатацыя аб'ектаў на прыаэрадромнай тэрыторыі
Артыкул 49. Дзяржаўная рэгістрацыя аэрадромаў (вертадромаў)
Артыкул 50. Допуск да эксплуатацыі аэрадромаў (вертадромаў) і пасадачных пляцовак. Парадак ажыццяўлення аэрапортнай дзейнасці
Артыкул 51. Выключэнне аэрадрома (вертадрома) з адпаведнага дзяржаўнага рэестра аэрадромаў (вертадромаў)
Артыкул 52. Маркіроўка аэрадромаў (вертадромаў) і пасадачных пляцовак
Артыкул 53. Маркіроўка нерухомых аб'ектаў і збудаванняў
ГЛАВА 8. КАМЕРЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У ГАЛІНЕ АВІЯЦЫІ
Артыкул 54. Камерцыйная дзейнасць у галіне авіяцыі авіяцыйных арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, зарэгістраваных у Рэспубліцы Беларусь
Артыкул 55. Камерцыйная дзейнасць у галіне авіяцыі замежных суб'ектаў
Артыкул 56. Выключаны
ГЛАВА 9. ПАЛЁТЫ ПАВЕТРАНЫХ СУДНАЎ
Артыкул 57. Арганізацыя і выкананне палётаў паветраных суднаў
Артыкул 58. Літарныя палёты

Артыкул 59. Выключаны
Артыкул 60. Допуск паветранага судна да палёту
Артыкул 61. Бартавая дакументацыя паветранага судна
Артыкул 62. Падрыхтоўка паветранага судна і экіпажа паветранага судна, аператара беспілотнага лятальнага апарата да палёту
Артыкул 63. Арганізацыя забеспячэння палётаў паветраных суднаў
Артыкул 64. План палёту грамадзянскага паветранага судна
Артыкул 65. Палёт паветранага судна над населенымі пунктамі
Артыкул 66. Дэманстрацыйны палёт паветранага судна
Артыкул 67. Абарона грамадзян і ахова навакольнага асяроддзя ад шкоднага ўздзеяння палётаў паветраных суднаў
Артыкул 68. Палёт паветранага судна са звышгукавой хуткасцю
Артыкул 69. Аказанне паслуг электрасувязі
Артыкул 70. Радыётэхнічнае забеспячэнне палётаў і авіяцыйная электрасувязь грамадзянскай і эксперыментальнай авіяцыі
Артыкул 71. Радыёсувязь пры выкананні палёту паветранага судна
Артыкул 72. Меры, якія прымяняюцца да паветранага судна-парушальніка
ГЛАВА 10. МІЖНАРОДНЫЯ ПАЛЁТЫ ПАВЕТРАНЫХ СУДНАЎ
Артыкул 73. Выкананне міжнародных палётаў паветраных суднаў
Артыкул 74. Узлёт і пасадка паветраных суднаў пры выкананні міжнародных палётаў паветраных суднаў
Артыкул 75. Прызнанне суднавых дакументаў, якія ёсць на борце паветраных суднаў замежных дзяржаў
Артыкул 76. Пагранічны, мытны і іншыя віды кантролю пры выкананні міжнародных палётаў паветраных суднаў
ГЛАВА 11. АВІЯЦЫЙНАЯ БЯСПЕКА
Артыкул 77. Забеспячэнне авіяцыйнай бяспекі
Артыкул 78. Надгляд з мэтай забеспячэння авіяцыйнай бяспекі
Артыкул 78[1]. Даванне персанальных даных пасажыраў паветраных суднаў і іншай інфармацыі аб перавозцы пасажыраў
ГЛАВА 12. БЯСПЕКА ПАЛЁТАЎ ПАВЕТРАНЫХ СУДНАЎ
Артыкул 79. Забеспячэнне бяспекі палётаў паветраных суднаў
Артыкул 80. Паведамленне аб авіяцыйнай падзеі
Артыкул 81. Расследаванне авіяцыйных падзей
Артыкул 82. Паўнамоцтвы камісіі па расследаванні авіяцыйнай падзеі
Артыкул 83. Захаванне матэрыялаў, звязаных з авіяцыйнай падзеяй
Артыкул 84. Работы, якія праводзяцца на месцы авіяцыйнай падзеі
Артыкул 85. Фінансаванне работ, звязаных з расследаваннем авіяцыйнай падзеі
Артыкул 86. Папярэджанне авіяцыйных падзей
Артыкул 87. Улік авіяцыйных падзей і прадстаўленне звестак па бяспецы палётаў паветраных суднаў
ГЛАВА 13. ПОШУКАВАЕ І АВАРЫЙНА-ВЫРАТАВАЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПАЛЁТАЎ ПАВЕТРАНЫХ СУДНАЎ
Артыкул 88. Паветранае судна, якое церпіць або пацярпела бедства
Артыкул 89. Сігналы бедства, тэрміновасці і папярэджання аб небяспецы
Артыкул 90. Паведамленні аб паветраным судне, якое церпіць або пацярпела бедства
Артыкул 91. Пошукавыя і аварыйна-выратавальныя работы
Артыкул 92. Супрацоўніцтва з замежнымі дзяржавамі пры правядзенні пошукавых і аварыйна-выратавальных работ

Артыкул 93. Аснашчэнне паветранага судна і падрыхтоўка яго экіпажа на выпадак авіяцыйнай падзеі
ГЛАВА 14. ПАВЕТРАНЫЯ ПЕРАВОЗКІ
Артыкул 94. Правілы паветраных перавозак
Артыкул 95. Дагаворы паветранай перавозкі
Артыкул 96. Дагавор фрахтавання паветранага судна (паветраны чартар)
Артыкул 97. Перавозачныя дакументы
Артыкул 98. Плата за паветраныя перавозкі і авіяцыйныя работы
Артыкул 99. Агульныя ўмовы паветранай перавозкі пасажыраў
Артыкул 100. Адмова перавозчыка ад выканання дагавора паветранай перавозкі пасажыра, дагавора паветранай перавозкі грузу
Артыкул 100[1]. Адмова ў заключэнні дагавора паветранай перавозкі пасажыру, унесенаму перавозчыкам у рэестр (базу даных) асоб, паветраная перавозка якіх абмежавана перавозчыкам
Артыкул 101. Адмова пасажыра паветранага судна ад выканання дагавора паветранай перавозкі пасажыра
Артыкул 102. Тэрмін дастаўкі грузу і паштовых адпраўленняў
Артыкул 103. Змяненне дагавора паветранай перавозкі грузу
Артыкул 104. Атрыманне грузу ў пункце прызначэння
Артыкул 105. Неатрыманне грузу
Артыкул 106. Паветраная перавозка небяспечных грузаў
ГЛАВА 15. АВІЯЦЫЙНЫЯ РАБОТЫ
Артыкул 107. Выкананне авіяцыйных работ
Артыкул 108. Дагавор на выкананне авіяцыйных работ
Артыкул 109. Выкананне авіяцыйных работ эксплуатантамі паветраных суднаў Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі замежнай дзяржавы
ГЛАВА 16. АДКАЗНАСЦЬ ПЕРАВОЗЧЫКА, ЭКСПЛУАТАНТА ПАВЕТРАНАГА СУДНА І ГРУЗААДПРАЎШЧЫКА
Артыкул 110. Агульныя прынцыпы адказнасці
Артыкул 111. Адказнасць перавозчыка за прычыненне шкоды жыццю або здароўю пасажыра паветранага судна
Артыкул 112. Адказнасць перавозчыка за страту, недастачу або пашкоджанне (псуту) багажу, грузу, а таксама рэчаў, якія знаходзяцца пры пасажыру
Артыкул 113. Памер адказнасці перавозчыка за страту, недастачу або пашкоджанне (псуту) багажу, грузу, а таксама рэчаў, якія знаходзяцца пры пасажыру
Артыкул 114. Выключаны
Артыкул 115. Адказнасць грузаадпраўшчыка
Артыкул 116. Адказнасць перавозчыка за страту, пашкоджанне (псуту), недастачу або пратэрміноўванне дастаўкі паштовых адпраўленняў
Артыкул 117. Пагадненні аб павышэнні адказнасці перавозчыка
ГЛАВА 17. ПРЭТЭНЗІІ І ІСКІ
Артыкул 118. Камерцыйныя і іншыя акты
Артыкул 119. Прэтэнзіі да перавозчыка, якія вынікаюць з паветранай перавозкі грузу
Артыкул 120. Права на прад'яўленне прэтэнзій і (або) іскаў
Артыкул 121. Перадача права на прад'яўленне прэтэнзій і іскаў
Артыкул 122. Тэрміны разгляду прэтэнзій
Артыкул 123. Тэрмін іскавай даўнасці
ГЛАВА 18. ВЫКЛЮЧАНА
Артыкул 124. Выключаны
Артыкул 125. Выключаны

ГЛАВА 19. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 126. Страціў сілу
Артыкул 127. Прызнанне, што Паветраны кодэкс Рэспублікі Беларусь і артыкул 16 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь» страцілі сілу
Артыкул 128. Уступленне ў сілу гэтага Кодэкса
Артыкул 129. Меры для рэалізацыі палажэнняў гэтага Кодэкса

Паветраны кодэкс Рэспублікі Беларусь устанаўлівае прававыя і арганізацыйныя асновы выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь і ажыццяўлення дзейнасці ў галіне авіяцыі ў мэтах забеспячэння патрэбнасцей грамадзян і эканомікі, абароны і бяспекі дзяржавы.

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 1. Асноўныя тэрміны і іх азначэнні, якія прымяняюцца ў гэтым Кодэксе

Для мэт гэтага Кодэкса прымяняюцца наступныя асноўныя тэрміны і іх азначэнні:

авіямадэль – лятальны апарат без чалавека на борце, кіраванне палётам якога магчыма толькі пры ўмове візуальнага кантакту з ім, а таксама свабоднялятальны апарат без кіравання;

авіяцыйная бяспека – стан абароненасці авіяцыі ад актаў незаконнага ўмяшання ў яе дзейнасць;

авіяцыйная арганізацыя – арганізацыя, якая мае мэтамі сваёй дзейнасці выкананне і (або) абслугоўванне паветраных перавозак, выкананне авіяцыйных работ, ажыццяўленне іншых відаў дзейнасці ў галіне авіяцыі;

авіяцыйная падзея – авіяцыйныя здарэнне або інцыдэнт, іншыя выпадкі, якія класіфікуюцца як авіяцыйная падзея ў адпаведнасці з авіяцыйнымі правіламі;

авіяцыйныя правілы – абавязковыя для выканання нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць дзейнасць, звязаную з выкарыстаннем паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, а таксама дзейнасць у галіне авіяцыі;

авіяцыйныя работы – работы, якія выконваюцца з выкарыстаннем палётаў паветраных суднаў у сельскай гаспадарцы, будаўніцтве, а таксама для аховы навакольнага асяроддзя, аказання медыцынскай дапамогі і іншых мэт;

авіяцыйны персанал – грамадзяне Рэспублікі Беларусь, замежныя грамадзяне, асобы без грамадзянства (далей – грамадзяне), якія маюць спецыяльную падрыхтоўку і ажыццяўляюць дзейнасць па забеспячэнні бяспекі палётаў паветраных суднаў і авіяцыйнай бяспекі, па арганізацыі, выкананні, а таксама забеспячэнні і абслугоўванні палётаў паветраных суднаў, паветраных перавозак і авіяцыйных работ, арганізацыі, абслугоўванні паветранага руху і кіраванні палётамі;

акт незаконнага ўмяшання ў дзейнасць авіяцыі – незаконнае дзеянне або пагроза такога дзеяння ў адносінах да пасажыраў, авіяцыйнага персаналу, паветранага судна або іншых аб'ектаў авіяцыі, якія ствараюць пагрозу для жыцця і (або) здароўя грамадзян, бяспекі палётаў паветраных суднаў і дзейнасці ў галіне авіяцыі;

аэрадром – зямельны ўчастак або водны аб'ект (яго частка), спецыяльна падрыхтаваныя і абсталяваныя для забеспячэння ўзлёту, пасадкі, рулення, стаянкі і абслугоўвання паветраных суднаў;

аэрадром (вертадром) сумеснага базавання – аэрадром (вертадром), на якім базіруюцца (размяшчаюцца) грамадзянскія і дзяржаўныя паветраныя судны;

аэрадром (вертадром) сумеснага выкарыстання – аэрадром (вертадром) дзяржаўнай авіяцыі або аэрадром (вертадром) грамадзянскай авіяцыі, на якіх ажыццяўляюцца ўзлёт, пасадка, руленне, стаянка і абслугоўванне грамадзянскіх паветраных суднаў, якія выконваюць рэйсы па раскладзе, і (або) дзяржаўных паветраных суднаў адпаведна без базавання (размяшчэння) на дадзеным аэрадроме (вертадроме);

аэранавігацыйнае абслугоўванне – абслугоўванне паветранага руху, забеспячэнне электрасувяззю, метэаралагічнае забеспячэнне, пошук і ратаванне, даванне аэранавігацыйнай інфармацыі;

аэрапорт – комплекс збудаванняў, прызначаны для прыёму, адпраўкі і стаянкі паветраных суднаў, іх тэхнічнага абслугоўвання, а таксама для абслугоўвання паветраных перавозак;

аэрапортная дзейнасць – дзейнасць па забеспячэнні прыёму, адпраўкі і стаянкі паветраных суднаў, іх тэхнічным абслугоўванні, а таксама па абслугоўванні паветраных перавозак;

аэравузел – блізка размешчаныя адзін да аднаго аэрадромы, арганізацыя і выкананне палётаў з якіх патрабуюць спецыяльнага ўзгаднення і каардынацыі;

бяспека палётаў паветраных суднаў – комплексная характарыстыка дзейнасці ў галіне авіяцыі, якая вызначае здольнасць выканання палётаў паветраных суднаў без пагрозы для жыцця і (або) здароўя грамадзян;

беспілотны авіяцыйны комплекс – сукупнасць функцыянальна звязаных элементаў, якая ўключае адзін або некалькі беспілотных лятальных апаратаў, сродкі забеспячэння ўзлёту і пасадкі і сродкі кіравання адным або некалькімі беспілотнымі лятальнымі апаратамі;

беспілотны лятальны апарат –лятальны апарат, прызначаны для выканання палётаў без экіпажа на борце пад кіраваннем аператара беспілотнага лятальнага апарата з пункта (пульта) кіравання, у тым ліку без яго візуальнага кантакту з гэтым лятальным апаратам, ці ў зададзеным аўтаномным рэжыме або шляхам спалучэння названых спосабаў;;

вертадром – зямельны ўчастак, водны аб'ект (яго частка) або пляцоўка на будынку ці збудаванні, спецыяльна падрыхтаваныя і абсталяваныя поўнасцю або часткова для забеспячэння ўзлёту, пасадкі, рулення, стаянкі і абслугоўвання верталётаў;

знешні пілот – асоба авіяцыйнага персаналу, якая прызначана эксплуатантам паветранага судна, мае пасведчанне знешняга пілота, ажыццяўляе функцыі па выкананні палёту грамадзянскага беспілотнага паветранага судна з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў дыстанцыйнага кіравання, маніпулюе адпаведнымі органамі кіравання палётам на працягу часу палёту гэтага грамадзянскага беспілотнага паветранага судна і нясе адказнасць за бяспечнае выкананне яго палёту;

унутраны аэрапорт – аэрапорт, прызначаны для прыёму і адпраўкі паветраных суднаў, якія выконваюць унутраныя паветраныя перавозкі;

унутраная паветраная перавозка – паветраная перавозка, пры выкананні якой пункты адпраўлення, прызначэння і пасадак размешчаны на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

паветраная перавозка – перавозка паветранымі суднамі пасажыраў, багажу, грузаў і паштовых адпраўленняў;

паветраны рух – палёты паветраных суднаў і іх манеўраванне на аэрадроме (вертадроме), пасадачнай пляцоўцы;

паветраная прастора Рэспублікі Беларусь – частка паветранай сферы, размешчаная ў межах тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

паветранае судна – лятальны апарат, які падтрымліваецца ў атмасферы за кошт узаемадзеяння з паветрам, адрознага ад узаемадзеяння з паветрам, адбітым ад зямной ці воднай паверхні;

паветранае судна замежнай дзяржавы – паветранае судна, зарэгістраванае ў рэестры паветраных суднаў замежнай дзяржавы або міжнароднай арганізацыі;

паветранае судна-парушальнік – паветранае судна, якое парушыла парадак выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь;

вышыннае збудаванне – збудаванне, вышыня якога ў адпаведнасці з Правіламі выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь і авіяцыйнымі правіламі можа прадстаўляць пагрозу для бяспекі палётаў паветраных суднаў;

дзяржаўная авіяцыя – від авіяцыі, якая выкарыстоўваецца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі, рэспубліканскім дзяржаўна-грамадскім аб'яднаннем «Добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту Рэспублікі Беларусь» для ажыццяўлення ваеннай, пагранічнай, мытнай службы, праваахоўнай дзейнасці, папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару, рашэння задач у галіне мабілізацыйнай падрыхтоўкі, а таксама для рашэння іншых дзяржаўных задач, звязаных з прымяненнем авіяцыі, якія вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь;

дзяржаўнае паветранае судна – паветранае судна, якое выкарыстоўваецца ў дзяржаўнай авіяцыі і зарэгістравана ў Дзяржаўным рэестры дзяржаўных паветраных суднаў Рэспублікі Беларусь;

дзяржаўны беспілотны лятальны апарат – беспілотны лятальны апарат, які выкарыстоўваецца ў дзяржаўнай авіяцыі і з'яўляецца дзяржаўным паветраным суднам;

грамадзянская авіяцыя – від авіяцыі, які выкарыстоўваецца ў мэтах забеспячэння патрэбнасцей грамадзян і арганізацый, папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару, а таксама выканання літарных палётаў;

грамадзянскі беспілотны лятальны апарат – беспілотны лятальны апарат, які выкарыстоўваецца ў грамадзянскай авіяцыі і не з'яўляецца паветраным суднам;

грамадзянскае беспілотнае паветранае судна – грамадзянскае паветранае судна без экіпажа на борце, якое знаходзіцца пад кіраваннем камандзіра грамадзянскага беспілотнага паветранага судна, які з'яўляецца знешнім пілотам, прызначанае для выканання палётаў па маршрутах абслугоўвання паветранага руху;

грамадзянскае паветранае судна – паветранае судна, якое выкарыстоўваецца ў грамадзянскай авіяцыі і зарэгістравана ў Дзяржаўным рэестры грамадзянскіх паветраных суднаў Рэспублікі Беларусь;грамадзянскае паветранае судна замежнай дзяржавы – паветранае судна замежнай дзяржавы, якое прызнаецца грамадзянскім паветраным суднам у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы, у якой яно зарэгістравана;

замежныя суб'екты – замежныя грамадзяне, асобы без грамадзянства, замежныя або міжнародныя арганізацыі, замежныя дзяржавы і (або) іх адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі;

выкарыстанне паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь – палёты паветраных суднаў і іншых лятальных апаратаў, за выключэннем авіямадэлей, у паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, а таксама дзейнасць, якая прадстаўляе пагрозу для бяспекі гэтых палётаў (правядзенне стрэльбаў, пускаў ракет, выбуховых работ, будаўніцтва вышынных збудаванняў, дзейнасць, у працэсе якой адбываюцца электрамагнітныя і іншыя выпраменьванні);

кантраляваная зона – тэрыторыя, якая знаходзіцца пад аховай і кантролем падраздзяленняў авіяцыйнай бяспекі авіяцыйных арганізацый з мэтай прадухілення і стрымання актаў незаконнага ўмяшання ў дзейнасць авіяцыі;

лятальны апарат – любое тэхнічнае прыстасаванне, прызначанае для выканання палётаў у атмасферы Зямлі;

лётная прыдатнасць – комплексная характарыстыка паветранага судна, авіяцыйнага рухавіка або паветранага вінта, якая вызначаецца рэалізаванымі ў іх канструкцыях прынцыпамі і тэхналагічнымі рашэннямі, якая дазваляе афармляць бяспечныя палёты ў чаканых умовах і пры ўстаноўленых метадах эксплуатацыі;

літарныя палёты – палёты паветраных суднаў па перавозцы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, кіраўнікоў замежных дзяржаў і ўрадаў, іншых асоб, якія падлягаюць дзяржаўнай ахове, а таксама членаў дзяржаўных і ўрадавых дэлегацый у паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь на паветраных суднах спецыяльнага і неспецыяльнага прызначэння, а таксама на паветраных суднах, якія выконваюць рэйсы па раскладзе;

асабісты надгляд – праверка грамадзяніна з мэтай выяўлення на яго целе і ў адзенні рэчываў, матэрыялаў і вырабаў, якія могуць быць выкарыстаны для здзяйснення актаў незаконнага ўмяшання ў дзейнасць авіяцыі;

міжнародная паветраная перавозка – паветраная перавозка пры выкананні міжнародных палётаў паветраных суднаў;

міжнародны палёт паветранага судна – палёт паветранага судна, пры выкананні якога пункты адпраўлення і прызначэння размешчаны адпаведна на тэрыторыях двух дзяржаў;

міжнародны аэрапорт – аэрапорт, адкрыты для прыёму і адпраўкі паветраных суднаў, у тым ліку выконваючых міжнародныя паветраныя перавозкі, у якім ажыццяўляюцца пагранічны, мытны і іншыя віды кантролю;

забеспячэнне бяспекі палётаў паветраных суднаў – комплекс мер, накіраваных на папярэджанне авіяцыйных падзей;

аб'екты авіяцыі – паветраныя судны, камунікацыі, аэрапорты, аэрадромы (вертадромы), тэхнічныя сродкі і іншыя аб'екты, неабходныя для ажыццяўлення дзейнасці ў галіне авіяцыі;

аб'екты Адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху – комплексы будынкаў, збудаванняў, камунікацый, а таксама наземныя аб'екты сродкаў і сістэм абслугоўвання паветранага руху, навігацыі, пасадкі і электрасувязі, прызначаныя для арганізацыі паветранага руху;

аператар беспілотнага лятальнага апарата – асоба авіяцыйнага персаналу, якая ажыццяўляе кіраванне беспілотным лятальным апаратам з дапамогай тэхнічных сродкаў;

органы абслугоўвання паветранага руху і кіравання палётамі – аператыўныя органы Адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху і органы карыстальнікаў паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, якія ажыццяўляюць абслугоўванне паветранага руху і кіраванне палётамі паветраных суднаў;

арніталагічнае забеспячэнне палётаў – комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на прадухіленне сутыкнення паветраных суднаў з птушкамі;

перавозчык – эксплуатант паветранага судна, які мае ў адпаведнасці з заканадаўствам права на выкананне паветраных перавозак;

пошукавыя работы – сістэма мер, накіраваных на своечасовае выяўленне паветранага судна, якое церпіць або пацярпела бедства, яго экіпажа і пасажыраў;

палёт паветранага судна – перамяшчэнне або завісанне паветранага судна ў паветранай прасторы;

палётная інфармацыя ў грамадзянскай авіяцыі – інфармацыя, зарэгістраваная з дапамогай бартавога самапісца палётнай інфармацыі або бартавой сістэмы рэгістрацыі даных;

карыстальнік паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь – арганізацыя або грамадзянін, якія выкарыстоўваюць паветраную прастору Рэспублікі Беларусь;

пасадачная пляцоўка – зямельны ўчастак або спецыяльна падрыхтаваная штучная пляцоўка, якія прыгодныя для ўзлёту, пасадкі, рулення і стаянкі паветраных суднаў і адпавядаюць патрабаванням авіяцыйных правіл;

Правілы выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь – нарматыўны прававы акт, які вызначае парадак арганізацыі выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, а таксама парадак яе выкарыстання;

перадпалётны надгляд – праверка членаў экіпажа паветранага судна, пасажыраў, багажу, у тым ліку рэчаў, якія знаходзяцца пры пасажырах, а таксама грузу і паштовых адпраўленняў, якія перавозяцца на паветраным судне, бартавых запасаў паветранага судна, якая ажыццяўляецца перад пачаткам выканання палёту паветранага судна;

прыаэрадромная тэрыторыя – абмежаваная па памерах тэрыторыя вакол аэрадрома (вертадрома), над якой ажыццяўляецца манеўраванне паветраных суднаў;

расследаванне авіяцыйнай падзеі – збор і аналіз інфармацыі, неабходнай для ўстанаўлення прычын узнікнення авіяцыйнай падзеі, падрыхтоўка высноў і выпрацоўка рэкамендацый па папярэджанні авіяцыйных падзей;

рэестр (база даных) асоб, паветраная перавозка якіх абмежавана перавозчыкам, – спіс, які змяшчае інфармацыю аб пасажырах, паветраная перавозка якіх абмежавана перавозчыкам у сувязі з прыцягненнем іх да адказнасці за ўчыненыя адміністрацыйныя правапарушэнні або злачынствы, вядзенне якога ажыццяўляе перавозчык;

рэкамендаваная практыка Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай авіяцыі – міжнародна-прававы акт, які прымаецца Міжнароднай арганізацыяй грамадзянскай авіяцыі і змяшчае патрабаванні да фізічных характарыстык, канфігурацыі, матэрыяльнай часткі, тэхнічных характарыстык, персаналу або правіл, аднастайнае прымяненне якога прызнаецца пажаданым у інтарэсах бяспекі, рэгулярнасці або эфектыўнасці міжнароднай грамадзянскай авіяцыі;санітарна-ахоўная зона – частка тэрыторыі вакол аэрадрома (вертадрома), якая ўстанаўліваецца з мэтай змяншэння шкоднага ўздзеяння, звязанага з дзейнасцю ў галіне авіяцыі, на здароўе грамадзян;

сертыфікат тыпу – афіцыйны дакумент, які пацвярджае адпаведнасць пэўнага тыпу паветранага судна, беспілотнага авіяцыйнага комплексу, авіяцыйнага рухавіка або паветранага вінта патрабаванням, устаноўленым авіяцыйнымі правіламі і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі, за выключэннем тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі;

сертыфікат экзэмпляра – афіцыйны дакумент, які пацвярджае адпаведнасць пэўнага экзэмпляра паветранага судна, беспілотнага авіяцыйнага комплексу, авіяцыйнага рухавіка або паветранага вінта патрабаванням, устаноўленым авіяцыйнымі правіламі і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі, за выключэннем тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі;

сертыфікацыя ў галіне грамадзянскай авіяцыі – дзейнасць спецыяльна ўпаўнаважанага органа ў галіне грамадзянскай авіяцыі па пацвярджэнні адпаведнасці аб'ектаў сертыфікацыі патрабаванням, устаноўленым авіяцыйнымі правіламі і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі, за выключэннем тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі;

сертыфікацыя ў галіне эксперыментальнай авіяцыі – дзейнасць спецыяльна ўпаўнаважанага органа ў галіне эксперыментальнай авіяцыі па пацвярджэнні адпаведнасці аб'ектаў сертыфікацыі патрабаванням, устаноўленым авіяцыйнымі правіламі і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі, за выключэннем тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі;

спецыяльна ўпаўнаважаны орган – дзяржаўны орган, якому Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь або Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь дадзены паўнамоцтвы ў адпаведнай галіне дзейнасці;

стандарт Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай авіяцыі – прыняты Міжнароднай арганізацыяй грамадзянскай авіяцыі міжнародна-прававы акт, які змяшчае патрабаванні да фізічных характарыстык, канфігурацыі, матэрыяльнай часткі, тэхнічных характарыстык, персаналу або правіл, аднастайнае прымяненне якога прызнаецца неабходным для забеспячэння бяспекі або рэгулярнасці міжнароднай грамадзянскай авіяцыі;

экіпаж паветранага судна – авіяцыйны персанал, якому ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку даручана выкананне абавязкаў па кіраванні паветраным суднам і яго абслугоўванні пры выкананні палётаў паветраных суднаў;

эксперыментальная авіяцыя – авіяцыя, якая выкарыстоўваецца для правядзення навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх работ, а таксама выпрабаванняў авіяцыйнай і іншай тэхнікі;

эксперыментальная авіяцыя – від авіяцыі, які выкарыстоўваецца для палётаў эксперыментальных паветраных суднаў пры правядзенні доследна-канструктарскіх работ па распрацоўцы эксперыментальных паветраных суднаў, мадыфікацыі эксперыментальных паветраных суднаў уласнай распрацоўкі або мадыфікацыі эксперыментальных паветраных суднаў пасля ўзгаднення з іх распрацоўшчыкамі;

эксперыментальнае паветранае судна – паветранае судна, якое выкарыстоўваецца ў эксперыментальнай авіяцыі і зарэгістравана ў Дзяржаўным рэестры эксперыментальных паветраных суднаў Рэспублікі Беларусь;

эксперыментальны беспілотны лятальны апарат – беспілотны лятальны апарат, які выкарыстоўваецца ў эксперыментальнай авіяцыі і з'яўляецца эксперыментальным паветраным суднам;

эксплуатант аэрадрома (вертадрома) – арганізацыя, якая эксплуатуе аэрадром (вертадром);

эксплуатант паветранага судна – арганізацыя або грамадзянін, якія маюць паветранае судна (паветраныя судны) на праве ўласнасці, гаспадарчага вядзення або аператыўнага кіравання, а таксама на падставе дагавора арэнды або іншага дагавора і выкарыстоўваюць паветранае судна (паветраныя судны) для палётаў.

**Артыкул 2. Суверэнітэт у адносінах да паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь**

Рэспубліцы Беларусь належыць поўны і выключны суверэнітэт у адносінах да паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 3. Сфера дзеяння гэтага Кодэкса**

Гэты Кодэкс рэгулюе адносіны ў галіне выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, адносіны, звязаныя з ажыццяўленнем дзейнасці ў галіне авіяцыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, знаходжаннем паветраных суднаў Рэспублікі Беларусь за межамі яе тэрыторыі, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам краіны знаходжання або міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, а таксама адносіны, звязаныя з выкананнем палётаў паветраных суднаў замежных дзяржаў у паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, калі іншае не прадугледжана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Дзеянне гэтага Кодэкса не распаўсюджваецца на адносіны, звязаныя з выкарыстаннем грамадзянамі і арганізацыямі авіямадэлей.

**Артыкул 4. Прававое рэгуляванне адносін у галіне выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь і авіяцыі**

Адносіны ў галіне выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь і авіяцыі рэгулююцца заканадаўствам аб выкарыстанні паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь і авіяцыі, а таксама міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь і іншымі міжнародна-прававымі актамі, якія змяшчаюць абавязацельствы Рэспублікі Беларусь.

Заканадаўства аб выкарыстанні паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь і авіяцыі грунтуецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і складаецца з гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства.

Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія змяшчаюцца ў гэтым Кодэксе, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь можа ўстанаўліваць асаблівасці прававога рэгулявання адносін, рэгламентаваных гэтым Кодэксам.

**Артыкул 5. Правілы выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь**

Правілы выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь вызначаюць парадак арганізацыі выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, а таксама парадак яе выкарыстання ў інтарэсах грамадзян і эканомікі, абароны і бяспекі дзяржавы.

Правілы выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь зацвярджае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 6. Авіяцыйныя правілы**

Авіяцыйныя правілы ў галіне грамадзянскай авіяцыі рэгулююць:

парадак сертыфікацыі ўзроўню кампетэнтнасці авіяцыйнага персаналу грамадзянскай авіяцыі і выдачы пасведчанняў авіяцыйнаму персаналу грамадзянскай авіяцыі;

парадак падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі авіяцыйнага персаналу грамадзянскай авіяцыі;

парадак арганізацыі і выканання палётаў грамадзянскіх паветраных суднаў;

парадак арганізацыі забеспячэння палётаў грамадзянскіх паветраных суднаў;

парадак ажыццяўлення дзейнасці па падтрыманні лётнай прыгоднасці грамадзянскіх паветраных суднаў і грамадзянскіх беспілотных паветраных суднаў;

парадак арганізацыі і правядзення расследавання авіяцыйных падзей, якія адбыліся з грамадзянскімі паветранымі суднамі Рэспублікі Беларусь, іх класіфікацыю і ўлік;

метэаралагічнае забеспячэнне грамадзянскай авіяцыі;

парадак эксплуатацыі грамадзянскіх беспілотных паветраных суднаў;

адносіны па дзяржаўнай рэгістрацыі грамадзянскіх паветраных суднаў, дзяржаўнай рэгістрацыі аэрадромаў (вертадромаў) грамадзянскай авіяцыі;

тэхнічнае абслугоўванне грамадзянскіх паветраных суднаў, грамадзянскіх беспілотных паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў, іх складовых частак;

арганізацыю збору, апрацоўкі і аналізу палётнай інфармацыі ў грамадзянскай авіяцыі;

адносіны па сертыфікацыі ў галіне грамадзянскай авіяцыі;

арганізацыю і парадак паветраных перавозак, парадак прад'яўлення і разгляду прэтэнзій, якія вынікаюць з паветраных перавозак;

арганізацыю абслугоўвання пасажыраў і багажу, апрацоўкі грузаў і пошты ў аэрапортах;

забеспячэнне наземнага абслугоўвання паветраных суднаў у аэрапортах;

арганізацыю работы транспартных сродкаў і спецыяльных машын на аэрадромах (вертадромах) грамадзянскай авіяцыі;

забеспячэнне грамадзянскай авіяцыі авіяцыйнымі гаруча-змазачнымі матэрыяламі і спецыяльнымі вадкасцямі;

арніталагічнае забеспячэнне палётаў грамадзянскіх паветраных суднаў;

сертыфікацыйныя патрабаванні да аэрадромаў (вертадромаў) грамадзянскай авіяцыі;

парадак уліку і патрабаванні да пасадачных пляцовак грамадзянскай авіяцыі;

аэрадромнае забеспячэнне палётаў на аэрадромах (вертадромах) грамадзянскай авіяцыі;

пошукавае і аварыйна-выратавальнае забеспячэнне палётаў грамадзянскіх паветраных суднаў;

абслугоўванне пасажыраў у залах афіцыйных асоб і дэлегацый у аэрапортах;

электрасвятлотэхнічнае забеспячэнне палётаў на аэрадромах (вертадромах) грамадзянскай авіяцыі;

адносіны ў галіне радыётэхнічнага забеспячэння палётаў, патрабаванні да сродкаў радыётэхнічнага забеспячэння палётаў і авіяцыйнай электрасувязі ў грамадзянскай авіяцыі;

абслугоўванне паветранага руху ў грамадзянскай авіяцыі;

выдачу аэранавігацыйнай інфармацыі ў грамадзянскай авіяцыі;

дзейнасць у галіне грамадзянскай авіяцыі, накіраваную на зніжэнне (прадухіленне) шкоднага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе;

пытанні забеспячэння бяспекі палётаў і авіяцыйнай бяспекі ў галіне грамадзянскай авіяцыі;

іншыя адносіны, звязаныя з дзейнасцю ў галіне грамадзянскай авіяцыі, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і (або) міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Авіяцыйныя правілы ў галіне дзяржаўнай авіяцыі рэгулююць:

парадак арганізацыі і выканання палётаў дзяржаўных паветраных суднаў;

парадак арганізацыі забеспячэння палётаў дзяржаўных паветраных суднаў;

парадак арганізацыі і правядзення работы па прадухіленні авіяцыйных падзей з дзяржаўнымі паветранымі суднамі;

парадак арганізацыі расследавання авіяцыйных падзей, якія адбыліся з дзяржаўнымі паветранымі суднамі, іх класіфікацыю і ўлік;

адносіны па дзяржаўнай рэгістрацыі дзяржаўных паветраных суднаў, дзяржаўнай рэгістрацыі аэрадромаў (вертадромаў) дзяржаўнай авіяцыі;

іншыя адносіны, звязаныя з дзейнасцю ў галіне дзяржаўнай авіяцыі, прадугледжаныя гэтым Кодэксам.

Авіяцыйныя правілы ў галіне эксперыментальнай авіяцыі рэгулююць:

парадак арганізацыі і выканання палётаў эксперыментальных паветраных суднаў;

парадак арганізацыі забеспячэння палётаў эксперыментальных паветраных суднаў;

парадак арганізацыі і правядзення расследавання авіяцыйных падзей, якія адбыліся з эксперыментальнымі паветранымі суднамі Рэспублікі Беларусь, іх класіфікацыю і ўлік;

адносіны па сертыфікацыі ў галіне эксперыментальнай авіяцыі;

адносіны па дзяржаўнай рэгістрацыі паветраных суднаў эксперыментальнай авіяцыі;

іншыя адносіны, звязаныя з дзейнасцю ў галіне эксперыментальнай авіяцыі, прадугледжаныя гэтым Кодэксам.

Авіяцыйныя правілы, якія рэгулююць дзейнасць у галіне грамадзянскай, эксперыментальнай і дзяржаўнай авіяцыі, распрацоўваюцца і зацвярджаюцца адпаведна спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі, спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне эксперыментальнай авіяцыі і спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне абароны.

Авіяцыйныя правілы, якія рэгулююць метэаралагічнае забеспячэнне грамадзянскай авіяцыі, зацвярджаюцца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі пасля ўзгаднення з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Авіяцыйныя правілы, якія рэгулююць дзейнасць, звязаную з выкарыстаннем паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, распрацоўваюцца і зацвярджаюцца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі і спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне абароны..

**Артыкул 7. Адказнасць за парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне выкарыстання паветранай прасторы і авіяцыі**

Асобы, вінаватыя ў парушэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне выкарыстання паветранай прасторы і авіяцыі, нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам.

## ГЛАВА 2
## ДЗЯРЖАЎНАЕ РЭГУЛЯВАННЕ ВЫКАРЫСТАННЯ ПАВЕТРАНАЙ ПРАСТОРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Артыкул 8. Дзяржаўнае рэгуляванне выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь**

Спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне абароны ажыццяўляе дзяржаўнае рэгуляванне выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь у цэлым.

Спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне грамадзянскай авіяцыі ажыццяўляе дзяржаўнае рэгуляванне выкарыстання часткі паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, якая ва ўстаноўленым парадку вызначана для паветраных трас, мясцовых паветраных ліній, раёнаў выканання авіяцыйных работ, аэрадромаў (вертадромаў) грамадзянскай авіяцыі, аэравузлоў .

**Артыкул 9. Дзяржаўныя прыярытэты ў выкарыстанні паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь**

Карыстальнікі паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь маюць роўныя правы на яе выкарыстанне.

Пры ўзнікненні патрэбнасці ў выкарыстанні паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь адначасова двума і болей карыстальнікамі паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь права на яго выкарыстанне даецца ў адпаведнасці з дзяржаўнымі прыярытэтамі ў наступным парадку:

адбіццё паветранага нападу, стрыманне акта тэрарызму, прадухіленне і спыненне парушэнняў Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь або ўзброенага ўварвання на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь;

аказанне дапамогі пры надзвычайных сітуацыях прыроднага і тэхнагеннага характару і ў іншых выпадках, якія пагражаюць жыццю і (або) здароўю грамадзян;

запуск, пасадка, пошук і эвакуацыя касмічных апаратаў і іх экіпажаў;

прадухіленне і спыненне парушэнняў патрабаванняў Правіл выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь;

выкананне літарных палётаў;

выкананне палётаў паветраных суднаў, у тым ліку ў інтарэсах абараназдольнасці і бяспекі дзяржавы, або ажыццяўленне іншай дзейнасці, звязанай з выкарыстаннем паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з рашэннямі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь або ў парадку, які вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь;

выкананне палётаў дзяржаўных паветраных суднаў у выпадку раптоўных праверак баявой гатоўнасці, а таксама ў выпадку перабазавання падраздзяленняў дзяржаўнай авіяцыі;

выкананне палётаў паветраных суднаў або ажыццяўленне іншай дзейнасці, звязанай з выкарыстаннем паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь;

выкананне паветраных перавозак пасажыраў і багажу ў рэгулярных зносінах (па раскладзе);

выкананне іншых палётаў дзяржаўных паветраных суднаў;

выкананне паветраных перавозак грузаў і паштовых адпраўленняў у рэгулярных зносінах (па раскладзе);

выкананне паветраных перавозак у нерэгулярных зносінах, выкананне авіяцыйных работ;

выкананне палётаў эксперыментальных паветраных суднаў;

выкананне навучальных, спартыўных і дэманстрацыйных палётаў паветраных суднаў;

выкананне іншых палётаў грамадзянскіх паветраных суднаў;

выкананне палётаў іншых лятальных апаратаў;

ажыццяўленне іншай дзейнасці, звязанай з выкарыстаннем паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 10. Арганізацыя выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь**

Арганізацыя выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь накіравана на забеспячэнне бяспечнага, эканамічнага і рэгулярнага паветранага руху, а таксама на ажыццяўленне іншай дзейнасці, звязанай з выкарыстаннем паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь.

Арганізацыя выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь уключае:

устанаўленне класіфікацыі і элементаў структуры паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь;

планаванне і каардынацыю выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з дзяржаўнымі прыярытэтамі, устаноўленымі часткай другой артыкула 9 гэтага Кодэкса;

забеспячэнне дазвольнага парадку выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь;

арганізацыю паветранага руху;

кантроль за выкананнем Правіл выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь.

Арганізацыя выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца органамі Адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху.

Органы Адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху вызначаюцца Палажэннем аб Адзінай сістэме арганізацыі паветранага руху, якое зацвярджае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Карыстальнікі паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь арганізуюць дзейнасць па выкарыстанні паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь ва ўстаноўленых для іх зонах і раёнах у парадку, які вызначаецца Правіламі выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 11. Структура паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь**

Структура паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь уключае наступныя элементы:

зоны;

паветраныя трасы;

маршруты;

мясцовыя паветраныя лініі;

раёны.

Элементы структуры паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь могуць устанаўлівацца на пастаяннай або часовай аснове ў адпаведнасці з патрэбнасцямі карыстальнікаў паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь.

Структура паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь зацвярджаецца ў парадку, які вызначаецца Правіламі выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь.

Устаноўленыя на пастаяннай аснове элементы структуры паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь публікуюцца ў дакументах аэранавігацыйнай інфармацыі.

**Артыкул 12. Класіфікацыя паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь**

Паветраная прастора Рэспублікі Беларусь класіфікуецца ў асобных элементах яе структуры ў адпаведнасці з Правіламі выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь і авіяцыйнымі правіламі.

**Артыкул 13. Дазвол на выкарыстанне паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь**

Выкарыстанне паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца на падставе дазволу адпаведнага органа Адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху, які выдаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных абзацамі другім – пятым часткі другой артыкула 9 гэтага Кодэкса, пры якіх абавязковым з'яўляецца паведамленне аб выкарыстанні паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь адпаведнаму органу Адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху.

**Артыкул 14. Забарона або абмежаванне выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь**

Выкарыстанне паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь або яго асобных раёнаў можа быць забаронена або абмежавана ў парадку, які вызначаецца заканадаўчымі актамі і Правіламі выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 15. Кантроль за выкананнем Правіл выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь**

Кантроль за выкананнем Правіл выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, не звязаны з правядзеннем праверак, ажыццяўляецца органамі Адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху, а таксама органамі абслугоўвання паветранага руху і кіравання палётамі ва ўстаноўленых для іх зонах і раёнах.

Спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне абароны ажыццяўляе кантроль за палётамі паветраных суднаў у паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, не звязаны з правядзеннем праверак, у частцы выяўлення паветраных суднаў-парушальнікаў.

Органы, указаныя ў частках першай і другой гэтага артыкула, а таксама карыстальнікі паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь абавязаны прымаць прадугледжаныя заканадаўствам меры для прадухілення і спынення парушэнняў Правіл выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 16. Аэранавігацыйнае абслугоўванне палётаў паветраных суднаў**

Парадак аэранавігацыйнага абслугоўвання палётаў паветраных суднаў устанаўліваецца авіяцыйнымі правіламі і іншымі актамі заканадаўства, а таксама міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Арганізацыя збору аэранавігацыйных даных і падрыхтоўка аэранавігацыйнай інфармацыі ў грамадзянскай авіяцыі ажыццяўляюцца ў адпаведнасці са стандартамі і рэкамендаванай практыкай Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай авіяцыі.

Аэранавігацыйнае абслугоўванне палётаў паветраных суднаў ажыццяўляецца са спагнаннем платы, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

**Артыкул 16$^{1}$. Метэаралагічнае забеспячэнне**

Метэаралагічнае забеспячэнне ўключае:

арганізацыю метэаралагічнага назірання за метэаралагічнымі ўмовамі каля паверхні зямлі;

арганізацыю аэралагічных назіранняў за станам атмасферы на вышынях;

аналіз звестак, атрыманых пры правядзенні радыёлакацыйнай, паветранай разведкі (даразведкі) надвор’я;

распрацоўку прагнозаў надвор’я, арганізацыю штармавога папярэджання і апавяшчэння;

правядзенне мерапрыемстваў для забеспячэння бяспекі палётаў;

забеспячэнне гідраметэаралагічнай інфармацыяй.

Парадак і ўмовы забеспячэння гідраметэаралагічнай інфармацыяй грамадзянскай авіяцыі вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Парадак і ўмовы забеспячэння гідраметэаралагічнай інфармацыяй эксперыментальнай авіяцыі вызначаюцца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне эксперыментальнай авіяцыі.

Парадак і ўмовы забеспячэння гідраметэаралагічнай інфармацыяй дзяржаўнай авіяцыі вызначаюцца дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі, якія маюць падраздзяленні дзяржаўнай авіяцыі.

## ГЛАВА 3
## ДЗЯРЖАЎНАЕ РЭГУЛЯВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ Ў ГАЛІНЕ АВІЯЦЫІ

### Артыкул 17. Віды авіяцыі Рэспублікі Беларусь

Авіяцыя Рэспублікі Беларусь падраздзяляецца на грамадзянскую, эксперыментальную і дзяржаўную.

Грамадзянская авіяцыя, якая выкарыстоўваецца для паветраных перавозак, выканання авіяцыйных работ за плату, належыць да камерцыйнай грамадзянскай авіяцыі.

Грамадзянская авіяцыя, якая выкарыстоўваецца ў некамерцыйных мэтах, належыць да авіяцыі агульнага прызначэння.

Выкарыстанне эксперыментальнай і дзяржаўнай авіяцыі з камерцыйнымі мэтамі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Выкарыстанне эксперыментальнай авіяцыі для паветраных перавозак забараняецца.

### Артыкул 18. Дзяржаўнае рэгуляванне дзейнасці ў галіне авіяцыі

Дзяржаўнае рэгуляванне дзейнасці ў галіне авіяцыі прадугледжвае сертыфікацыю ў галіне грамадзянскай і эксперыментальнай авіяцыі, распрацоўку і зацвярджэнне авіяцыйных правіл.

Дзяржаўнае рэгуляванне дзейнасці ў галіне грамадзянскай авіяцыі ажыццяўляецца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі.

Арганізацыя дзейнасці ў галіне дзяржаўнай авіяцыі і кіраванне гэтай дзейнасцю ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі, якія маюць падраздзяленні дзяржаўнай авіяцыі.

Дзяржаўнае рэгуляванне дзейнасці ў галіне эксперыментальнай авіяцыі ажыццяўляецца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне эксперыментальнай авіяцыі.

### Артыкул 19. Выключаны.

### Артыкул 20. Сертыфікацыя ў галіне грамадзянскай і эксперыментальнай авіяцыі

Сертыфікацыі ў галіне грамадзянскай авіяцыі падлягаюць:

распрацоўка і выраб грамадзянскіх паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў, іх складовых частак і авіяцыйных трэнажораў;

грамадзянскія паветраныя судны, грамадзянскія беспілотныя паветраныя судны, авіяцыйныя рухавікі, паветраныя вінты, авіяцыйныя трэнажоры;

забеспячэнне і выкананне паветраных перавозак;

выкананне авіяцыйных работ;

дзейнасць па тэхнічным абслугоўванні і рамонце, падтрыманні лётнай прыдатнасці грамадзянскіх паветраных суднаў, грамадзянскіх беспілотных паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў, іх складовых частак;

падрыхтоўка, перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі авіяцыйнага персаналу грамадзянскай авіяцыі;

узровень кампетэнтнасці авіяцыйнага персаналу грамадзянскай авіяцыі;

дзейнасць па абслугоўванні паветранага руху;

аэрадромы (вертадромы) грамадзянскай авіяцыі;

аэрадромы (вертадромы) сумеснага базавання і аэрадромы (вертадромы) сумеснага выкарыстання ў частцы арганізацыі і выканання палётаў грамадзянскіх паветраных суднаў;

аэрапортавая дзейнасць;

абсталяванне аэрадромаў (вертадромаў);

сродкі навігацыі, назірання і сувязі грамадзянскай авіяцыі;

дзейнасць па медыцынскім забеспячэнні палётаў грамадзянскіх паветраных суднаў.

Выдача, працягненне, унясенне змяненняў, абмежаванняў, прыпыненне дзеяння і ануляванне сертыфікатаў у галіне грамадзянскай авіяцыі ажыццяўляюцца ў парадку, які ўстанаўліваецца авіяцыйнымі правіламі ў галіне грамадзянскай авіяцыі.

Сертыфікацыі ў галіне эксперыментальнай авіяцыі падлягаюць эксперыментальныя паветраныя судны, беспілотныя авіяцыйныя комплексы, якія ўключаюць эксперыментальныя беспілотныя лятальныя апараты з максімальнай узлётнай масай сем і больш кілаграмаў, авіяцыйныя рухавікі, паветраныя вінты.

Патрабаванні, што прад'яўляюцца да аб'ектаў сертыфікацыі ў галіне грамадзянскай і эксперыментальнай авіяцыі, устанаўліваюцца авіяцыйнымі правіламі і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі, за выключэннем тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нармавання і стандартызацыі.Ажыццяўленне відаў дзейнасці і функцыянаванне аб'ектаў сертыфікацыі, указаных у частках першай і трэцяй гэтага артыкула, без праходжання сертыфікацыі ў галіне грамадзянскай і эксперыментальнай авіяцыі і наяўнасці выдадзенага па яе выніках адпаведнага сертыфіката або з парушэннем патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да аб'ектаў сертыфікацыі ў галіне грамадзянскай і эксперыментальнай авіяцыі, забараняюцца, за выключэннем лётных выпрабаванняў паветраных суднаў пры іх вырабе, мадыфікацыі, рамонце і сертыфікацыі.

**Артыкул 21. Дзяржаўная падтрымка развіцця авіяцыі**

Дзяржаўная падтрымка развіцця авіяцыі ажыццяўляецца шляхам:

правядзення бюджэтнай палітыкі, якая забяспечвае развіццё авіяцыі Рэспублікі Беларусь;

стымулявання ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі дзейнасці інвестараў, якія прымаюць удзел у фінансаванні развіцця грамадзянскай і эксперыментальнай авіяцыі;

абароны ў адпаведнасці з заканадаўствам у міжнародных арганізацыях інтарэсаў арганізацый і грамадзян, а таксама іншых суб'ектаў грамадзянскага права, якія ажыццяўляюць дзейнасць, што спрыяе развіццю грамадзянскай і эксперыментальнай авіяцыі Рэспублікі Беларусь;

інфармацыйнага і прававога забеспячэння развіцця авіяцыі Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь могуць быць устаноўлены іншыя формы дзяржаўнай падтрымкі авіяцыі.

**Артыкул 22. Кантроль у галіне авіяцыі**

У рамках абавязацельстваў, прынятых у адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, кантроль за бяспекай палётаў паветраных суднаў і авіяцыйнай бяспекай у галіне грамадзянскай авіяцыі ажыццяўляецца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі, а таксама інспектарскімі органамі, якія ствараюцца гэтым органам.

З мэтай правядзення кантролю за бяспекай палётаў паветраных суднаў і авіяцыйнай бяспекай інспектарскія органы маюць права доступу да аб'ектаў грамадзянскай авіяцыі.

Кантроль за дзейнасцю ў галіне дзяржаўнай авіяцыі ў частцы забеспячэння бяспекі палётаў паветраных суднаў Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне абароны.

Кантроль за дзейнасцю ў галіне эксперыментальнай авіяцыі ў частцы забеспячэння бяспекі палётаў паветраных суднаў Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне эксперыментальнай авіяцыі.

## ГЛАВА 4
## ПАВЕТРАНЫЯ СУДНЫ, ГРАМАДЗЯНСКІЯ БЕСПІЛОТНЫЯ ЛЯТАЛЬНЫЯ АПАРАТЫ

**Артыкул 23. Патрабаванні да лётнай прыдатнасці паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў**

Патрабаванні да лётнай прыдатнасці паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў устанаўліваюцца авіяцыйнымі правіламі і іншымі абавязковымі для выканання тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі і з'яўляюцца абавязковымі для арганізацый і грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, якія бяруць удзел у стварэнні, выпрабаваннях, серыйнай вытворчасці, прыёмцы, эксплуатацыі, рамонце, мадэрнізацыі, пераабсталяванні і мадыфікацыі паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў і іх дапрацоўцы па бюлетэнях распрацоўшчыка і (або) вытворцы.

**Артыкул 24. Сертыфікат эксплуатанта паветранага судна, сертыфікат эксплуатанта грамадзянскага беспілотнага паветранага судна**

Эксплуатант грамадзянскага паветранага судна абавязаны атрымаць сертыфікат эксплуатанта паветранага судна, які сведчыць адпаведнасць эксплуатанта грамадзянскага паветранага судна ўстаноўленым заканадаўствам патрабаванням, за выключэннем арганізацый і грамадзян, якія эксплуатуюць лёгкія і звышлёгкія лятальныя апараты, у тым ліку планёры, дэльтапланы, парапланы, а таксама паветраныя судны аматарскай канструкцыі, аэрастатычныя апараты ў некамерцыйных мэтах і грамадзянскія і беспілотныя лятальныя апараты.

Сертыфікат эксплуатанта паветранага судна дае права эксплуатанту грамадзянскага паветранага судна ажыццяўляць дзейнасць у адпаведнасці з умовамі і абмежаваннямі, якія змяшчаюцца ў эксплуатацыйных спецыфікацыях, што з'яўляюцца неад'емнай часткай сертыфіката эксплуатанта паветранага судна.

Эксплуатант грамадзянскага беспілотнага паветранага судна абавязаны атрымаць сертыфікат эксплуатанта грамадзянскага беспілотнага паветранага судна, які сведчыць адпаведнасць эксплуатанта грамадзянскага беспілотнага паветранага судна патрабаванням, устаноўленым авіяцыйнымі правіламі.

Сертыфікат эксплуатанта грамадзянскага беспілотнага паветранага судна дае права эксплуатанта грамадзянскага беспілотнага паветранага судна ажыццяўляць дзейнасць у адпаведнасці з умовамі і абмежаваннямі, якія змяшчаюцца ў эксплуатацыйных спецыфікацыях, што з'яўляюцца неад'емнай часткай сертыфіката эксплуатанта грамадзянскага беспілотнага паветранага судна.**Артыкул 25. Сертыфікацыя грамадзянскіх і эксперыментальных паветраных суднаў, беспілотных авіяцыйных комплексаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў**

Сертыфікацыя грамадзянскіх і эксперыментальных паветраных суднаў, беспілотных авіяцыйных комплексаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў новага тыпу пацвярджаецца выдачай сертыфіката тыпу, калі ў ходзе яе ажыццяўлення выяўлена, што грамадзянскія і эксперыментальныя паветраныя судны, беспілотныя авіяцыйныя комплексы, авіяцыйныя рухавікі і паветраныя вінты новага тыпу адпавядаюць патрабаванням, устаноўленым авіяцыйнымі правіламі і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі, за выключэннем тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі, а канструкцыі грамадзянскіх і эксперыментальных паветраных суднаў, беспілотных авіяцыйных комплексаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў новага тыпу прызнаны ў якасці тыпавых.

Сертыфікацыя адзінкавых экзэмпляраў грамадзянскіх і эксперыментальных паветраных суднаў, беспілотных авіяцыйных комплексаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў пацвярджаецца выдачай сертыфіката экзэмпляра, калі ў ходзе яе ажыццяўлення выяўлена, што такія грамадзянскія і эксперыментальныя паветраныя судны, беспілотныя авіяцыйныя комплексы, авіяцыйныя рухавікі і паветраныя вінты адпавядаюць патрабаванням, устаноўленым авіяцыйнымі правіламі і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі, за выключэннем тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі.

Грамадзянскае паветранае судна, эксперыментальнае паветранае судна, беспілотны авіяцыйны комплекс, авіяцыйны рухавік і паветраны вінт у працэсе вытворчасці павінны праходзіць ва ўстаноўленым парадку выпрабаванні і праверкі, па завяршэнні якіх на грамадзянскае паветранае судна, эксперыментальнае паветранае судна, эксперыментальны беспілотны лятальны апарат выдаецца сертыфікат лётнай прыдатнасці (пасведчанне аб прыдатнасці да палётаў), а на авіяцыйны рухавік і паветраны вінт іх вытворцам афармляецца дакумент, эквівалентны сертыфікату лётнай прыдатнасці (пасведчанню аб прыдатнасці да палётаў). Указаныя дакументы сведчаць, што канструкцыі і характарыстыкі грамадзянскага паветранага судна, эксперыментальнага паветранага судна, эксперыментальнага беспілотнага лятальнага апарата, авіяцыйнага рухавіка і паветранага вінта адпавядаюць іх тыпавым канструкцыям, а выраб – патрабаванням, устаноўленым авіяцыйнымі правіламі і іншымі абавязковымі для выканання тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі.

Сертыфікацыя ў галіне грамадзянскай авіяцыі ў мэтах выдачы сертыфіката тыпу, сертыфіката экзэмпляра, сертыфіката лётнай прыдатнасці (пасведчання аб прыдатнасці да палётаў) ажыццяўляецца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі.

Сертыфікацыя ў галіне эксперыментальнай авіяцыі ў мэтах выдачы сертыфіката тыпу, сертыфіката экзэмпляра, сертыфіката лётнай прыдатнасці (пасведчання аб прыдатнасці да палётаў) ажыццяўляецца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне эксперыментальнай авіяцыі.

Сертыфікат тыпу, сертыфікат экзэмпляра анулююцца органамі, якія выдалі гэтыя дакументы, у выпадку прыняцця ў адпаведнасці з заканадаўствам кампетэнтным органам рашэння аб спыненні эксплуатацыі паветраных суднаў гэтага тыпу, гэтага экзэмпляра паветранага судна. Орган, які прыняў рашэнне аб ануляванні адпаведнага сертыфіката, не пазней за пяць рабочых дзён з дня прыняцця такога рашэння інфармуе аб гэтым у пісьмовым выглядзе ўладальніка гэтага сертыфіката з указаннем прычын яго анулявання.

Дзеянне сертыфіката лётнай прыдатнасці (пасведчання аб прыдатнасці да палётаў) прыпыняецца органам, які выдаў гэты сертыфікат лётнай прыдатнасці (пасведчанне аб прыдатнасці да палётаў), у выпадку:

парушэння правіл лётнай эксплуатацыі і тэхнічнага абслугоўвання, прадугледжаных эксплуатацыйнай дакументацыяй паветранага судна;

выяўлення ў працэсе эксплуатацыі і рамонту паветранага судна парушэнняў патрабаванняў да лётнай прыдатнасці, устаноўленых авіяцыйнымі правіламі і іншымі абавязковымі для выканання тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі.

Орган, які прыняў рашэнне аб прыпыненні дзеяння сертыфіката лётнай прыдатнасці (пасведчання аб прыдатнасці да палётаў), не пазней за пяць рабочых дзён з дня прыняцця такога рашэння інфармуе аб гэтым у пісьмовым выглядзе ўладальніка сертыфіката лётнай прыдатнасці (пасведчання аб прыдатнасці да палётаў) з указаннем прычын прыпынення яго дзеяння.

Аднаўленне дзеяння сертыфіката лётнай прыдатнасці (пасведчання аб прыдатнасці да палётаў) ажыццяўляецца пасля ліквідацыі прычын, якія выклікалі прыпыненне яго дзеяння, органам, які прыняў рашэнне аб прыпыненні дзеяння сертыфіката лётнай прыдатнасці (пасведчання аб прыдатнасці да палётаў), у парадку, які ўстанаўліваецца авіяцыйнымі правіламі ў галіне грамадзянскай авіяцыі і авіяцыйнымі правіламі ў галіне эксперыментальнай авіяцыі..

Парадак прызнання сертыфікатаў лётнай прыдатнасці (пасведчанняў аб прыдатнасці да палётаў) у Рэспубліцы Беларусь устанаўліваецца авіяцыйнымі правіламі ў галіне грамадзянскай авіяцыі.

## Артыкул 26. Падтрыманне лётнай прыдатнасці грамадзянскіх і эксперыментальных паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў

Забеспячэнне адпаведнасці канструкцыі грамадзянскага і эксперыментальнага паветраных суднаў, авіяцыйнага рухавіка або паветранага вінта тыпавой канструкцыі на этапах іх распрацоўкі, выпрабаванняў і эксплуатацыі аж да спісання патрабаванням да лётнай прыдатнасці і заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя ўскладаецца адпаведна на распрацоўшчыкаў грамадзянскага і эксперыментальнага паветраных суднаў, авіяцыйнага рухавіка або паветранага вінта.

Забеспячэнне адпаведнасці грамадзянскага паветранага судна, якое вырабляецца серыйна, авіяцыйнага рухавіка або паветранага вінта, сертыфікаванаму тыпу ўскладаецца на іх вытворцу.

Забеспячэнне адпаведнасці канструкцыі грамадзянскага паветранага судна, авіяцыйнага рухавіка або паветранага вінта тыпавой канструкцыі і патрабаванням да лётнай прыдатнасці і заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя на этапе іх эксплуатацыі аж да спісання зыходзячы з ацэнкі тэхнічнага стану, бяспекі і эканамічнай эфектыўнасці эксплуатацыі паветранага судна, авіяцыйнага рухавіка або паветранага вінта ў выпадках, вызначаных заканадаўствам, можа ўскладацца на спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне грамадзянскай авіяцыі.

Падтрыманне грамадзянскага і эксперыментальнага паветраных суднаў у працэсе эксплуатацыі ў стане, які адпавядае патрабаванням авіяцыйных правіл і іншых абавязковых для выканання тэхнічных нарматыўных прававых актаў, а таксама патрабаванням заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя, правіл лётнай эксплуатацыі і тэхнічнага абслугоўвання грамадзянскага і эксперыментальнага паветраных суднаў, прадугледжаных эксплуатацыйнай дакументацыяй грамадзянскага і эксперыментальнага паветраных суднаў пэўнага тыпу, ускладаецца на эксплуатантаў грамадзянскага і эксперыментальнага паветраных суднаў.

Кантроль за падтрыманнем адпаведнасці грамадзянскіх паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў на этапах іх распрацоўкі, вытворчасці і эксплуатацыі патрабаванням да лётнай прыдатнасці і заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя з'яўляецца часткай кантролю за бяспекай палётаў паветраных суднаў і авіяцыйнай бяспекай у галіне грамадзянскай авіяцыі і ажыццяўляецца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі, а таксама інспектарскімі органамі, якія ствараюцца ім.

Кантроль за падтрыманнем адпаведнасці эксперыментальных паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў на этапе іх эксплуатацыі патрабаванням да лётнай прыдатнасці ў частцы забеспячэння бяспекі палётаў паветраных суднаў Рэспублікі Беларусь з'яўляецца часткай кантролю за бяспекай палётаў паветраных суднаў у галіне эксперыментальнай авіяцыі і ажыццяўляецца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне эксперыментальнай авіяцыі.

Эксплуатанты паветраных суднаў абавязаны прадстаўляць спецыяльна ўпаўнаважанаму органу ў галіне грамадзянскай авіяцыі і спецыяльна ўпаўнаважанаму органу ў галіне эксперыментальнай авіяцыі, якія ажыццяўляюць сертыфікацыю грамадзянскіх і эксперыментальных паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў, а таксама распрацоўшчыку гэтай авіяцыйнай тэхнікі інфармацыю аб тэхнічным стане паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў і аб асаблівасцях іх эксплуатацыі. Парадак прадстаўлення гэтай інфармацыі вызначаецца авіяцыйнымі правіламі.

**Артыкул 27. Прызнанне сертыфіката тыпу і экспартнага сертыфіката лётнай прыдатнасці паветраных суднаў, авіяцыйных рухавікоў і паветраных вінтоў замежнай дзяржавы**

Паветранае судна, авіяцыйны рухавік або паветраны вінт, якія выраблены (мадэрнізаваны) у замежнай дзяржаве і паступаюць у Рэспубліку Беларусь для эксплуатацыі ў грамадзянскай авіяцыі, павінны мець сертыфікат тыпу, выдадзены кампетэнтным органам замежнай дзяржавы – распрацоўшчыка ці іншай замежнай дзяржавы або міжнароднай арганізацыі. Парадак прызнання сертыфіката тыпу паветранага судна, авіяцыйнага рухавіка або паветранага вінта замежнай дзяржавы ўстанаўліваецца авіяцыйнымі правіламі ў галіне грамадзянскай авіяцыі.

Паветранае судна, якое паступае ў Рэспубліку Беларусь для эксплуатацыі ў грамадзянскай авіяцыі, павінна мець экспартны сертыфікат лётнай прыдатнасці (пасведчанне аб прыдатнасці да палётаў) або іншы эквівалентны дакумент, выдадзены кампетэнтным органам дзяржавы-экспарцёра.

Спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне грамадзянскай авіяцыі прызнае сертыфікат тыпу, выдадзены кампетэнтным органам замежнай дзяржавы – распрацоўшчыка ці іншай замежнай дзяржавы або міжнароднай арганізацыяй, а таксама экспартны сертыфікат лётнай прыдатнасці (пасведчанне аб прыдатнасці да палётаў) або іншы эквівалентны дакумент, выдадзены кампетэнтным органам дзяржавы-экспарцёра, калі яны адпавядаюць міжнародным стандартам, якія прызнаюцца Рэспублікай Беларусь.

**Артыкул 28. Выключаны**

**Артыкул 29. Дзяржаўная рэгістрацыя паветраных суднаў**

Паветраныя судны падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам і могуць быць зарэгістраваны толькі ў адпаведным рэестры адной дзяржавы.

Не дапускаецца ўнясенне паветранага судна ў адпаведны дзяржаўны рэестр паветраных суднаў, калі яно не выключана з іншага дзяржаўнага рэестра паветраных суднаў, рэестра паветраных суднаў замежнай дзяржавы або міжнароднай арганізацыі.

Рэгістрацыя паветраных суднаў і вядзенне адпаведнага дзяржаўнага рэестра паветраных суднаў ускладаюцца на спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне грамадзянскай авіяцыі, спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне эксперыментальнай авіяцыі і спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне абароны.

На паветранае судна, унесенае ў адпаведны дзяржаўны рэестр паветраных суднаў, выдаецца рэгістрацыйнае пасведчанне, што з'яўляецца фактам прызнання яго нацыянальнай прыналежнасці.

Эксплуатант паветранага судна не мае права рэгістраваць паветранае судна ў рэестры паветраных суднаў замежнай дзяржавы або міжнароднай арганізацыі, калі яно ва ўстаноўленым парадку не выключана з адпаведнага дзяржаўнага рэестра паветраных суднаў.

За дзяржаўную рэгістрацыю грамадзянскіх і эксперыментальных паветраных суднаў выплачваецца дзяржаўная пошліна.

**Артыкул 29[1]. Дзяржаўны ўлік грамадзянскіх беспілотных лятальных апаратаў**

**Грамадзянскія беспілотныя лятальныя апараты падлягаюць дзяржаўнаму ўліку ў парадку, які вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.**

**Дзяржаўны ўлік грамадзянскіх беспілотных лятальных апаратаў ажыццяўляе спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне грамадзянскай авіяцыі.**

**Грамадзянскі беспілотны лятальны апарат здымаецца з дзяржаўнага ўліку ў выпадку:**

**страты (разбурэнне канструкцыі грамадзянскага беспілотнага лятальнага апарата, не якое дазваляе ажыццяўляць яго эксплуатацыю, згуба, крадзеж і іншае);**

**продажу або пераходу на законных падставах права валодання, карыстання і (або) распараджэння грамадзянскім беспілотным лятальным апаратам да іншай асобы.**

**Эксплуатацыя грамадзянскіх беспілотных лятальных апаратаў без ажыццяўлення іх дзяржаўнага ўліку забараняецца. Патрабаванні да эксплуатацыі грамадзянскіх беспілотных лятальных апаратаў вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.**

**Артыкул 30. Выключэнне паветранага судна з адпаведнага дзяржаўнага рэестра паветраных суднаў**

Паветранае судна выключаецца з адпаведнага дзяржаўнага рэестра паветраных суднаў у выпадку:

спісання або зняцця паветранага судна з эксплуатацыі;

продажу паветранага судна або пераходу на іншых законных падставах права ўласнасці на яго замежнаму суб'екту пры ўмове вывазу паветранага судна за межы Рэспублікі Беларусь;

перадачы паветранага судна ў арэнду замежным суб'ектам, калі дагаворам арэнды прадугледжана яго рэгістрацыя ў рэестры паветраных суднаў замежнай дзяржавы або міжнароднай арганізацыі;

перадачы паветранага судна са складу аднаго віду авіяцыі ў склад іншага віду авіяцыі;

выяўлення парушэння парадку дзяржаўнай рэгістрацыі паветранага судна, устаноўленага авіяцыйнымі правіламі.

У выпадку выключэння паветранага судна з адпаведнага дзяржаўнага рэестра паветраных суднаў рэгістрацыйнае пасведчанне губляе сілу.

**Артыкул 31. Допуск паветраных суднаў да эксплуатацыі**

Грамадзянскае паветранае судна, якое мае сертыфікат тыпу, дапускаецца да эксплуатацыі, калі яно зарэгістравана ў Дзяржаўным рэестры грамадзянскіх паветраных суднаў Рэспублікі Беларусь і на яго маецца сертыфікат лётнай прыдатнасці (пасведчанне аб прыдатнасці да палётаў).

Дзяржаўныя і эксперыментальныя паветраныя судны, зарэгістраваныя ў адпаведным дзяржаўным рэестры паветраных суднаў, дапускаюцца да эксплуатацыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі авіяцыйных правіл.

Спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне грамадзянскай авіяцыі, спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне эксперыментальнай авіяцыі, спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне абароны мае права забараніць эксплуатацыю паветранага судна, зарэгістраванага ў адпаведным дзяржаўным рэестры паветраных суднаў, у выпадку:

анулявання сертыфіката тыпу або сертыфіката экзэмпляра (пры іх наяўнасці);

прыняцця ў адпаведнасці з заканадаўствам кампетэнтным органам рашэння аб спыненні эксплуатацыі паветраных суднаў гэтага тыпу, гэтага экзэмпляра паветранага судна;

выяўлення ў працэсе эксплуатацыі і рамонту паветранага судна парушэнняў патрабаванняў да лётнай прыдатнасці, устаноўленых авіяцыйнымі правіламі і іншымі абавязковымі для выканання тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі;

адсутнасці на паветранае судна рэгістрацыйнага пасведчання, сертыфіката лётнай прыдатнасці (пасведчання аб прыдатнасці да палётаў) на грамадзянскае і эксперыментальнае паветраныя судны;

прыпынення дзеяння сертыфіката лётнай прыдатнасці (пасведчання аб прыдатнасці да палётаў);

парушэння правіл лётнай эксплуатацыі і тэхнічнага абслугоўвання, прадугледжаных эксплуатацыйнай дакументацыяй паветранага судна.

**Артыкул 32. Допуск дзяржаўнага паветранага судна да эксплуатацыі ў грамадзянскай авіяцыі**

Дзяржаўнае паветранае судна, тып якога дапускаецца да эксплуатацыі ў грамадзянскай авіяцыі, можа эксплуатавацца ў грамадзянскай авіяцыі пасля зняцця з яго абсталявання ваеннага прызначэння, атрымання сертыфіката лётнай прыдатнасці (пасведчання аб прыдатнасці да палётаў) і ўнясення яго ў Дзяржаўны рэестр грамадзянскіх паветраных суднаў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 33. Абазначэнні, якія наносяцца на паветраныя судны**

Пры ўнясенні паветранага судна ў адпаведны дзяржаўны рэестр паветраных суднаў яму прысвойваюцца дзяржаўны і рэгістрацыйны знакі. Дзяржаўнаму паветранаму судну, акрамя таго, можа прысвойвацца бартавы нумар.

Парадак прысваення нумароў і знакаў, а таксама парадак іх нанясення на паветраныя судны вызначаюцца авіяцыйнымі правіламі.

Акрамя дзяржаўных і рэгістрацыйных знакаў, а таксама бартавых нумароў на паветранае судна могуць наносіцца апазнавальныя знакі, сімвалы, надпісы і эмблемы з выкананнем патрабаванняў, устаноўленых авіяцыйнымі правіламі.

Палёты паветранага судна Рэспублікі Беларусь, якое не мае неабходных у адпаведнасці з гэтым артыкулам нумароў і знакаў, забараняюцца, за выключэннем выпрабавальных палётаў, якія выконваюцца пасля яго вырабу ці правядзення рамонту, і ў іншых выпадках, устаноўленых заканадаўствам.

**Артыкул 34. Пазыўны радыёсігнал грамадзянскага паветранага судна**

Грамадзянскаму паветранаму судну, абсталяванаму сродкамі радыёсувязі, прысвойваецца пазыўны радыёсігнал.

Парадак прысваення пазыўнога радыёсігналу вызначаецца авіяцыйнымі правіламі.

**Артыкул 35. Абмежаванне права карыстання грамадзянскімі паветранымі суднамі**

Абмежаванне права карыстання грамадзянскімі паветранымі суднамі (прыцягненне да паветраных перавозак для дзяржаўных патрэб, часовае адабранне грамадзянскіх паветраных суднаў і іншыя абмежаванні) дапускаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам у ваенны час або ў выпадку ўвядзення ваеннага або надзвычайнага становішча.

## ГЛАВА 5
## АВІЯЦЫЙНЫ ПЕРСАНАЛ

**Артыкул 36. Агульныя палажэнні аб авіяцыйным персанале**

Авіяцыйны персанал (авіяцыйны персанал грамадзянскай авіяцыі, авіяцыйны персанал эксперыментальнай авіяцыі і авіяцыйны персанал дзяржаўнай авіяцыі) падраздзяляецца на лётны састаў і нялётны авіяцыйны персанал.

Пералік пасад авіяцыйнага персаналу зацвярджаецца ў парадку, які вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да авіяцыйнага персаналу, устанаўліваюцца авіяцыйнымі правіламі.

На пасады авіяцыйнага персаналу не прымаюцца грамадзяне, якія маюць непагашаную або нязнятую судзімасць за ўчыненне наўмыснага злачынства, а таксама не адпавядаюць іншым патрабаванням, што прад'яўляюцца да авіяцыйнага персаналу заканадаўствам.

Авіяцыйны персанал грамадзянскай авіяцыі, які ажыццяўляе абслугоўванне паветранага руху і кіраванне палётамі, не мае права прымаць удзел у забастоўках.

Кантроль за дзейнасцю авіяцыйнага персаналу ажыццяўляецца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі ў рамках кантролю за бяспекай палётаў паветраных суднаў і авіяцыйнай бяспекай у галіне грамадзянскай авіяцыі і спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне абароны ў рамках кантролю за дзейнасцю ў галіне дзяржаўнай авіяцыі ў частцы забеспячэння бяспекі палётаў паветраных суднаў Рэспублікі Беларусь, а таксама спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне эксперыментальнай авіяцыі ў рамках кантролю за дзейнасцю ў галіне эксперыментальнай авіяцыі ў частцы забеспячэння бяспекі палётаў паветраных суднаў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 37. Сертыфікацыя ўзроўню кампетэнтнасці авіяцыйнага персаналу грамадзянскай авіяцыі**

Пералік авіяцыйнага персаналу грамадзянскай авіяцыі, узровень кампетэнтнасці якога падлягае сертыфікацыі, а таксама парадак сертыфікацыі ўзроўню кампетэнтнасці авіяцыйнага персаналу вызначаюцца авіяцыйнымі правіламі.

Сертыфікат (пасведчанне) замежнай дзяржавы, выдадзены грамадзяніну, які адносіцца да авіяцыйнага персаналу грамадзянскай авіяцыі, прызнаецца ў Рэспубліцы Беларусь правадзейным пры ўмове, калі гэты сертыфікат (пасведчанне) адпавядае міжнародным стандартам, якія прызнаюцца Рэспублікай Беларусь.

**Артыкул 38. Падрыхтоўка, перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі авіяцыйнага персаналу грамадзянскай авіяцыі**

Падрыхтоўка, перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі авіяцыйнага персаналу грамадзянскай авіяцыі ажыццяўляюцца ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь, іншых арганізацыях Рэспублікі Беларусьпры наяўнасці сертыфіката Рэспублікі Беларусь, выдадзенага спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі, і ў замежных арганізацыях.

Грамадзянін, які прайшоў падрыхтоўку, перападрыхтоўку або павышэнне кваліфікацыі ў галіне грамадзянскай авіяцыі за мяжой у арганізацыі, якая мае сертыфікат на права правядзення гэтага віду навучання, прызнаны (адобраны) у Рэспубліцы Беларусь, мае права на ажыццяўленне дзейнасці па забеспячэнні бяспекі палётаў паветраных суднаў і авіяцыйнай бяспекі, па арганізацыі, выкананні, а таксама забеспячэнні і абслугоўванні палётаў паветраных суднаў, паветраных перавозак і авіяцыйных работ, па арганізацыі, абслугоўванні паветранага руху і кіраванні палётамі пры наяўнасці выдадзенага ўпаўнаважаным дзяржаўным органам пасведчання аб прызнанні дакумента аб адукацыі, выдадзенага ў замежнай дзяржаве, і ўстанаўленні яго эквівалентнасці (адпаведнасці) дакументу аб адукацыі Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул $38^1$. Медыцынскае забеспячэнне палётаў**

Медыцынскае забеспячэнне палётаў грамадзянскіх паветраных суднаў ажыццяўляецца арганізацыямі аховы здароўя, іншымі арганізацыямі, якія маюць сертыфікат па медыцынскім забеспячэнні палётаў грамадзянскіх паветраных суднаў, выдадзены спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі, і ўключае:

медыцынскі агляд авіяцыйнага персаналу грамадзянскай авіяцыі;

правядзенне перадпалётных (перадзменных) медыцынскіх аглядаў авіяцыйнага персаналу грамадзянскай авіяцыі;

медыцынскую дапамогу авіяцыйнаму персаналу грамадзянскай авіяцыі ў перыяд паміж медыцынскімі аглядамі;

своечасовае аказанне хуткай медыцынскай дапамогі авіяцыйнаму персаналу грамадзянскай авіяцыі, пасажырам паветраных суднаў і іншым асобам, якія знаходзяцца на тэрыторыі аэрапорта;

правядзенне санітарна-проціэпідэмічных мерапрыемстваў;

аснашчэнне грамадзянскіх паветраных суднаў неабходнымі запасамі лекавых сродкаў і медыцынскіх вырабаў;

навучанне экіпажа грамадзянскага паветранага судна метадам аказання першай дапамогі пры станах, якія з’яўляюцца пагрозай для жыцця і (або) здароўя пасажыраў на борце грамадзянскага паветранага судна;

падрыхтоўку і ўдзел прыцягнутых медыцынскіх работнікаў у правядзенні пошукавых і аварыйна-выратавальных работ;

псіхафізіялагічнае і псіхалагічнае абследаванне авіяцыйнага персаналу грамадзянскай авіяцыі.

Парадак медыцынскага забеспячэння палётаў грамадзянскіх паветраных суднаў вызначаецца авіяцыйнымі правіламі, якія зацвярджаюцца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі і ўпаўнаважаным органам у галіне аховы здароўя.

Медыцынскі агляд авіяцыйнага персаналу грамадзянскай авіяцыі можа праводзіцца таксама ў замежных арганізацыях, якія маюць сертыфікат на права правядзення такога агляду, прызнаны ў Рэспубліцы Беларусь.

Парадак медыцынскага забеспячэння палётаў дзяржаўных паветраных суднаў вызначаецца авіяцыйнымі правіламі, якія зацвярджаюцца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне абароны па ўзгадненні з рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, у дзейнасці якіх выкарыстоўваецца дзяржаўная авіяцыя, і рэспубліканскім дзяржаўна-грамадскім аб'яднаннем «Добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту Рэспублікі Беларусь».

Парадак медыцынскага забеспячэння палётаў эксперыментальных паветраных суднаў вызначаецца авіяцыйнымі правіламі, якія зацвярджаюцца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне эксперыментальнай авіяцыі па ўзгадненні з упаўнаважаным органам у галіне аховы здароўя і спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне абароны.

## ГЛАВА 6
## ЭКІПАЖ ПАВЕТРАНАГА СУДНА, АПЕРАТАР БЕСПІЛОТНАГА ЛЯТАЛЬНАГА АПАРАТА

### Артыкул 39. Састаў экіпажа паветранага судна

Экіпаж паветранага судна складаецца з лётнага экіпажа (камандзіра паветранага судна, іншых асоб лётнага складу) і кабіннага экіпажа (бортаператараў і бортправаднікоў).

Экіпаж грамадзянскага беспілотнага паветранага судна складаецца з аднаго або некалькіх знешніх пілотаў.

Састаў экіпажа паветранага судна пэўнага тыпу ўстанаўліваецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі інструкцыі па лётнай эксплуатацыі паветранага судна гэтага тыпу.

Не дазваляецца выкананне палёту паветранага судна ў выпадку, калі састаў лётнага экіпажа меншы за мінімальна ўстаноўлены інструкцыяй па лётнай эксплуатацыі паветранага судна гэтага тыпу.

Лётны экіпаж паветранага судна, як правіла, складаецца з грамадзян Рэспублікі Беларусь. Уключэнне ў лётны экіпаж грамадзянскага паветранага судна замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі, у лётны экіпаж эксперыментальнага паветранага судна – спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне эксперыментальнай авіяцыі, у лётны экіпаж дзяржаўнага паветранага судна – спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне абароны.

### Артыкул 40. Права члена экіпажа грамадзянскага паветранага судна, грамадзянскага беспілотнага паветранага судна на адмову ад выканання палёту

Член экіпажа грамадзянскага паветранага судна, **грамадзянскага беспілотнага паветранага судна** мае права адмовіцца ад выканання палёту, калі, паводле яго меркавання, ёсць аргументаваныя падставы апасацца за паспяховае завяршэнне палёту.

### Артыкул 41. Пакрыццё шкоды члену экіпажа паветранага судна

Шкода, прычыненая жыццю і (або) здароўю члена экіпажа паветранага судна пры выкананні ім службовых абавязкаў, кампенсуецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

### Артыкул 42. Камандзір паветранага судна

Камандзірам паветранага судна можа быць грамадзянін, які мае ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках сертыфікат (пасведчанне) пілота (лётчыка), а таксама падрыхтоўку і вопыт, неабходныя для самастойнага кіравання паветраным суднам пэўнага тыпу.

Камандзірам грамадзянскага беспілотнага паветранага судна можа быць фізічная асоба, якая валодае падрыхтоўкай і вопытам, неабходнымі для самастойнага кіравання грамадзянскім беспілотным паветраным суднам пэўнага тыпу, і мае пасведчанне знешняга пілота.

Камандзір паветранага судна кіруе работай экіпажа паветранага судна, адказвае за дысцыпліну і парадак на паветраным судне, прымае неабходныя меры для забеспячэння бяспекі палёту паветранага судна.

Парадак прызначэння камандзіра паветранага судна, яго правы і абавязкі вызначаюцца гэтым Кодэксам і авіяцыйнымі правіламі.

**Артыкул 42$^1$. Аператар беспілотнага лятальнага апарата**

Аператарам беспілотнага лятальнага апарата можа быць асоба, якая мае ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках сертыфікат (пасведчанне) на права самастойнага кіравання беспілотным лятальным апаратам, у тым ліку такім, што ўваходзіць у склад беспілотнага авіяцыйнага комплекса, пэўнага тыпу.

Аператар беспілотнага лятальнага апарата непасрэдна кіруе беспілотным лятальным апаратам і прымае неабходныя меры для забеспячэння бяспекі палёту беспілотнага лятальнага апарата.

Парадак прызначэння аператара беспілотнага лятальнага апарата і яго кампетэнцыя вызначаюцца гэтым Кодэксам і авіяцыйнымі правіламі.

**Артыкул 43. Правы камандзіра паветранага судна**

Камандзір паветранага судна мае права:

прымаць канчатковае рашэнне аб вылеце, палёце і пасадцы паветранага судна, зліве ў палёце паліва, скіданні багажу, грузаў і паштовых адпраўленняў, аб адступленні ад плана палёту і змяненні рэжыму палёту, аб спыненні палёту і пасадцы паветранага судна на запасным аэрадроме або вымушанай пасадцы па-за аэрадромам (вертадромам), аб забеспячэнні бяспекі палёту паветранага судна;

аддаваць у межах сваёй кампетэнцыі любому грамадзяніну, які знаходзіцца на борце паветранага судна, распараджэнні і каманды, якія падлягаюць абавязковаму выкананню;

прымаць усе неабходныя меры, у тым ліку і прымусовыя, да грамадзян, якія ствараюць сваімі дзеяннямі пагрозу для бяспекі палёту паветранага судна і не падпарадкоўваюцца яго распараджэнням і камандам;

ажыццяўляць асабісты кантроль за бяспекай пасажыраў у палёце ў выпадку ўзнікнення пагрозы для бяспекі палёту паветранага судна;

змяняць маршрут палёту, ажыццяўляць перасячэнне Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь, выконваць пасадку паветранага судна на аэрадроме (вертадроме), не прадугледжаным заданнем на палёт, у выпадку ўзнікнення пагрозы для жыцця і (або) здароўя пасажыраў і членаў экіпажа паветранага судна;

адступаць ад патрабаванняў авіяцыйных правіл у экстрэмальнай сітуацыі, якая пагражае гібеллю грамадзян, для ратавання іх жыцця;

кантраляваць узровень прафесійных ведаў і навыкаў экіпажа паветранага судна, а таксама якасць работы авіяцыйнага персаналу, які абслугоўвае паветранае судна;

правяраць сертыфікаты (пасведчанні) членаў экіпажа паветранага судна, а таксама наяўнасць у іх неабходных запісаў і адзнак;

адхіляць ад выканання задання на палёт любога члена экіпажа паветранага судна, узровень падрыхтоўкі якога не адпавядае заданню на палёт, і патрабаваць яго замены;

прымаць рашэнне аб правядзенні ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства надгляду пасажыраў, багажу, у тым ліку рэчаў, якія знаходзяцца пры пасажырах, а таксама грузаў і паштовых адпраўленняў, якія перавозяцца на паветраным судне, бартавых запасаў паветранага судна ў выпадку адсутнасці падраздзялення авіяцыйнай бяспекі авіяцыйнай арганізацыі.

Камандзір грамадзянскага паветранага судна мае права быць даверанай асобай эксплуатанта паветранага судна, заключаць ад яго імені дагаворы ў інтарэсах выканання задання на палёт, забеспячэння бяспекі палёту паветранага судна, жыцця і (або) здароўя пасажыраў і членаў экіпажа паветранага судна, а таксама захаванасці паветранага судна.

Камандзір паветранага судна можа мець іншыя правы ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 43[1]. Правы аператара беспілотнага лятальнага апарата**

Аператар беспілотнага лятальнага апарата мае права:

прымаць канчатковае рашэнне аб вылеце, палёце і пасадцы беспілотнага лятальнага апарата, зліве ў палёце паліва, скіданні багажу і грузаў, аб адступленні ад плана палёту і змяненні рэжыму палёту, аб спыненні палёту і пасадцы беспілотнага лятальнага апарата на запасным аэрадроме, пасадачнай пляцоўцы або вымушанай пасадцы па-за аэрадромам, пасадачнай пляцоўкай, аб забеспячэнні бяспекі палёту беспілотнага лятальнага апарата;

змяняць маршрут палёту, выконваць пасадку беспілотнага лятальнага апарата на аэрадроме, пасадачнай пляцоўцы, не прадугледжаных заданнем на палёт, у выпадках, вызначаных Правіламі выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь;

адступаць ад патрабаванняў авіяцыйных правіл у экстрэмальнай сітуацыі, якая пагражае гібеллю грамадзян, для ратавання іх жыцця;

кантраляваць якасць работы авіяцыйнага персаналу, які абслугоўвае беспілотны лятальны апарат.

Аператар беспілотнага лятальнага апарата можа мець іншыя правы ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 44. Дзеянні экіпажа паветранага судна, аператара беспілотнага лятальнага апарата ў выпадку небяспекі**

Калі паветранаму судну, якое знаходзіцца ў палёце, пагражае небяспека, камандзір паветранага судна і іншыя члены экіпажа паветранага судна абавязаны прыняць усе магчымыя меры для захавання жыцця і (або) здароўя пасажыраў і членаў экіпажа паветранага судна, а таксама паветранага судна і змешчанай на ім маёмасці.

Камандзір паветранага судна, які прыняў сігнал бедства іншага паветранага або марскога судна, судна ўнутранага плавання, а таксама які выявіў судны, якія церпяць або пацярпелі бедства, зону надзвычайнай сітуацыі або грамадзян, якія знаходзяцца ў небяспецы, абавязаны паведаміць аб гэтым органу абслугоўвання паветранага руху і кіравання палётамі і аказаць магчымую дапамогу, якая не стварае пагрозы для бяспекі пасажыраў, членаў экіпажа паветранага судна і паветранага судна.

Калі беспілотнаму лятальнаму апарату, які знаходзіцца ў палёце, пагражае небяспека, аператар беспілотнага лятальнага апарата абавязаны прыняць усе магчымыя меры для захавання беспілотнага лятальнага апарата пры ўмове забеспячэння бяспекі іншых паветраных суднаў і грамадзян.

Аператар беспілотнага лятальнага апарата ў выпадку выяўлення паветранага судна або судна ўнутранага плавання, якія церпяць або пацярпелі бедства, зоны надзвычайнай сітуацыі або грамадзян, якія знаходзяцца ў небяспецы, абавязаны паведаміць аб гэтым органу абслугоўвання паветранага руху і кіравання палётамі.

## ГЛАВА 7
## АЭРАДРОМЫ (ВЕРТАДРОМЫ), ПАСАДАЧНЫЯ ПЛЯЦОЎКІ, АЭРАПОРТЫ І АБ'ЕКТЫ АДЗІНАЙ СІСТЭМЫ АРГАНІЗАЦЫІ ПАВЕТРАНАГА РУХУ

### Артыкул 45. Аэрадромы (вертадромы) і пасадачныя пляцоўкі

Па сваім прызначэнні аэрадромы (вертадромы) падраздзяляюцца на аэрадромы (вертадромы) дзяржаўнай авіяцыі, аэрадромы (вертадромы) грамадзянскай авіяцыі, аэрадромы (вертадромы) сумеснага базавання і аэрадромы (вертадромы) сумеснага выкарыстання.

Аэрадром (вертадром) падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі.

Парадак адкрыцця, закрыцця і эксплуатацыі аэрадрома (вертадрома) вызначаецца авіяцыйнымі правіламі.

Аэрадромы (вертадромы) сумеснага базавання і аэрадромы (вертадромы) сумеснага выкарыстання павінны адпавядаць патрабаванням, якія прад'яўляюцца да аэрадромаў (вертадромаў) грамадзянскай авіяцыі.

Рашэнне аб наданні аэрадрому (вертадрому) грамадзянскай авіяцыі або аэрадрому (вертадрому) дзяржаўнай авіяцыі статусу аэрадрома (вертадрома) сумеснага базавання або аэрадрома (вертадрома) сумеснага выкарыстання прымаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, калі іншае ім не вызначана.

Рашэнне аб адкрыцці аэрадрома (вертадрома) для выканання міжнародных палётаў паветраных суднаў прымае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Пасадачныя пляцоўкі могуць не мець стацыянарных збудаванняў і абсталявання, але падлягаюць уліку ў адпаведнасці з авіяцыйнымі правіламі.

У інтарэсах эксперыментальнай авіяцыі выкарыстоўваюцца аэрадромы (вертадромы) грамадзянскай авіяцыі, аэрадромы (вертадромы) дзяржаўнай авіяцыі, аэрадромы (вертадромы) сумеснага базавання, аэрадромы (вертадромы) сумеснага выкарыстання, а таксама аэрадромы (вертадромы) часовыя і пасадачныя пляцоўкі.

Аэрадром (вертадром), на якім базіруюцца паветраныя судны аднаго рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання або адной арганізацыі, зарэгістраваныя ў розных дзяржаўных рэестрах паветраных суднаў, не з'яўляецца аэрадромам (вертадромам) сумеснага базавання.

### Артыкул 46. Аэрапорты

З мэтай прыёму і адпраўкі паветраных суднаў, абслугоўвання паветраных перавозак аэрапорт павінен мець у сваім складзе аэрадром, вертадром, аэравакзал, неабходныя сістэмы, абсталяванне, спецыяльныя транспарт, тэхніку, механізмы і іншую інфраструктуру, прызначаныя для прыёму, адпраўкі, стаянкі, наземнага і тэхнічнага абслугоўвання паветраных суднаў, забеспячэння паветраных перавозак..

Па сваім прызначэнні аэрапорты падраздзяляюцца на ўнутраныя аэрапорты і міжнародныя аэрапорты.

Рашэнне аб адкрыцці аэрапорта для выканання міжнародных палётаў паветраных суднаў прымае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 47. Распрацоўка праектнай дакументацыі, узвядзенне, мадэрнізацыя і эксплуатацыя аэрадромаў (вертадромаў), аэрапортаў і аб'ектаў Адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху

Распрацоўка праектнай дакументацыі, узвядзенне, мадэрнізацыя і эксплуатацыя аэрадромаў (вертадромаў), аэрапортаў і аб'ектаў адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага Кодэкса і іншых актаў заканадаўства.

Для аэрадромаў (вертадромаў) грамадзянскай авіяцыі, аэрапортаў распрацоўваюцца і (або) карэктуюцца планы развіцця з абгрунтаваннем эканамічнай і іншай мэтазгоднасці планаваных мерапрыемстваў, устанаўленнем пераліку прыярытэтных задач, фарміраваннем планаў развіцця інфраструктуры аэрадромаў (вертадромаў) грамадзянскай авіяцыі, аэрапортаў з вызначэннем этапаў іх рэалізацыі ў кароткатэрміновай і доўгатэрміновай перспектывах. Пры распрацоўцы і (або) карэкціроўцы планаў развіцця аэрадромаў (вертадромаў) грамадзянскай авіяцыі, аэрапортаў улічваюцца існуючы і прагназаваны аб'ёмы паветранага руху аэрадромаў (вертадромаў) грамадзянскай авіяцыі, аэрапортаў, прагноз аб'ёму перавозак, патрабаванні да арганізацыі і добраўпарадкавання тэрыторыі, што прад'яўляюцца эксплуатантамі паветраных суднаў. Планы развіцця аэрадромаў (вертадромаў) грамадзянскай авіяцыі, аэрапортаў распрацоўваюцца эксплуатантамі аэрадромаў (вертадромаў) грамадзянскай авіяцыі або па іх замове спецыялізаванай арганізацыяй.Забеспячэнне адпаведнасці аэрадрома (вертадрома) у перыяд яго эксплуатацыі патрабаванням, устаноўленым авіяцыйнымі правіламі і іншымі актамі заканадаўства, ускладаецца на эксплуатанта аэрадрома (вертадрома).

Радыётэхнічнае, святлотэхнічнае і метэаралагічнае абсталяванне, якое ўстанаўліваецца на аэрадромах (вертадромах), а таксама аб'екты Адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху павінны адпавядаць патрабаванням прыдатнасці да эксплуатацыі, устаноўленым авіяцыйнымі правіламі.

Будаўніцтва і эксплуатацыя дарог, якія вядуць да аэрапортаў, рэгулярны рух пасажырскага транспарту на іх, а таксама электрасувязь паміж населенымі пунктамі і аэрапортамі забяспечваюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі і фінансуюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, а таксама іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

**Артыкул 48. Будаўніцтва, размяшчэнне і эксплуатацыя аб'ектаў на прыаэрадромнай тэрыторыі**

Прыаэрадромная тэрыторыя ўключае ў сябе зону кантролю і ўліку аб'ектаў і перашкод, якая прылягае да аэрадрома (вертадрома). Памер прыаэрадромнай тэрыторыі вызначаецца авіяцыйнымі правіламі.

Будаўніцтва аб'ектаў у межах прыаэрадромнай тэрыторыі павінна ажыццяўляцца ў адпаведнасці з заканадаўствам і па ўзгадненні з эксплуатантам аэрадрома (вертадрома) з выкананнем патрабаванняў забеспячэння бяспекі палётаў паветраных суднаў і з улікам магчымага прычынення шкоды абсталяваннем аэрадрома (вертадрома) і палётамі паветраных суднаў арганізацыям і грамадзянам, у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам, а таксама магчымага шкоднага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе.

Узгадненне ўзвядзення, рэканструкцыі, рамонту, рэстаўрацыі, добраўпарадкавання, зносу збудаванняў на прыаэрадромнай тэрыторыі аэрадрома грамадзянскай авіяцыі і за яе межамі, а таксама ў зоне дзеяння радыётэхнічных сродкаў, якія забяспечваюць палёты, будынкаў, збудаванняў, ліній электрасувязі і электраперадачы, радыётэхнічных і іншых аб'ектаў, якія могуць пагражаць бяспецы палётаў паветраных суднаў або ствараць перашкоды ў працы радыётэхнічных сродкаў, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з авіяцыйнымі правіламі і іншымі актамі заканадаўства.

Размяшчэнне на прыаэрадромнай тэрыторыі і за яе межамі, а таксама ў зоне дзеяння радыётэхнічных сродкаў, якія забяспечваюць палёты, будынкаў, збудаванняў, ліній электрасувязі і электраперадачы, радыётэхнічных і іншых аб'ектаў, якія могуць пагражаць бяспецы палётаў паветраных суднаў або ствараць перашкоды ў рабоце радыётэхнічных сродкаў, павінна быць узгоднена з уладальнікам (эксплуатантам) аэрадрома (вертадрома) і ўладальнікам (эксплуатантам) радыётэхнічных сродкаў.

Арганізацыі і грамадзяне, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, якія парушылі патрабаванні бяспекі палётаў паветраных суднаў, уключаючы патрабаванні, якія прад'яўляюцца да будаўніцтва, размяшчэння і эксплуатацыі аб'ектаў на прыаэрадромнай тэрыторыі, а таксама карыстальнікі зямельных участкаў, размешчаных у межах прыаэрадромнай тэрыторыі, вышыня насаджэнняў на якіх перавышае ўстаноўленыя заканадаўствам межы, абавязаны па патрабаванні ўладальніка аэрапорта (аэрадрома (вертадрома)) або ўпаўнаважанай ім асобы прыпыніць будаўніцтва або іншую дзейнасць на гэтай тэрыторыі і правесці ва ўстаноўлены тэрмін ліквідацыю дапушчаных парушэнняў.

**Артыкул 49. Дзяржаўная рэгістрацыя аэрадромаў (вертадромаў)**

Аэрадромы (вертадромы) грамадзянскай авіяцыі падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі і ўнясенню ў Дзяржаўны рэестр аэрадромаў грамадзянскай авіяцыі Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны рэестр вертадромаў грамадзянскай авіяцыі Рэспублікі Беларусь у парадку, які вызначаецца авіяцыйнымі правіламі ў галіне грамадзянскай авіяцыі.

За дзяржаўную рэгістрацыю аэрадромаў (вертадромаў) грамадзянскай авіяцыі выплачваецца дзяржаўная пошліна.

Уладальніку аэрадрома (вертадрома) грамадзянскай авіяцыі выдаецца пасведчанне аб яго рэгістрацыі ў Дзяржаўным рэестры аэрадромаў грамадзянскай авіяцыі Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным рэестры вертадромаў грамадзянскай авіяцыі Рэспублікі Беларусь.

Вядзенне Дзяржаўнага рэестра аэрадромаў грамадзянскай авіяцыі Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага рэестра вертадромаў грамадзянскай авіяцыі Рэспублікі Беларусь ускладаецца на спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне грамадзянскай авіяцыі.

Аэрадромы (вертадромы) дзяржаўнай авіяцыі падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне абароны з уключэннем даных аб іх у Дзяржаўны рэестр аэрадромаў дзяржаўнай авіяцыі Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны рэестр вертадромаў дзяржаўнай авіяцыі Рэспублікі Беларусь у парадку, які вызначаецца авіяцыйнымі правіламі ў галіне грамадзянскай авіяцыі.

Уладальніку аэрадрома (вертадрома) дзяржаўнай авіяцыі выдаецца пасведчанне аб яго рэгістрацыі ў Дзяржаўным рэестры аэрадромаў дзяржаўнай авіяцыі Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным рэестры вертадромаў дзяржаўнай авіяцыі Рэспублікі Беларусь.

Вядзенне Дзяржаўнага рэестра аэрадромаў дзяржаўнай авіяцыі Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага рэестра вертадромаў дзяржаўнай авіяцыі Рэспублікі Беларусь ускладаецца на спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне абароны.

**Артыкул 50. Допуск да эксплуатацыі аэрадромаў (вертадромаў) і пасадачных пляцовак. Парадак ажыццяўлення аэрапортнай дзейнасці**

Допуск да эксплуатацыі аэрадромаў (вертадромаў) грамадзянскай авіяцыі, а таксама допуск да эксплуатацыі ў мэтах выкарыстання грамадзянскай авіяцыяй аэрадромаў (вертадромаў) сумеснага базавання і аэрадромаў (вертадромаў) сумеснага выкарыстання ажыццяўляюцца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі на падставе адпаведных сертыфікатаў.

Аэрадромы (вертадромы) дзяржаўнай авіяцыі, а таксама аэрадромы (вертадромы) сумеснага базавання і аэрадромы (вертадромы) сумеснага выкарыстання ў мэтах выкарыстання дзяржаўнай авіяцыяй дапускаюцца да эксплуатацыі ў парадку, вызначаным авіяцыйнымі правіламі.

Эксплуатацыя аэрадрома (вертадрома) грамадзянскай авіяцыі без пасведчання аб яго рэгістрацыі ў Дзяржаўным рэестры аэрадромаў грамадзянскай авіяцыі Рэспублікі

Беларусь, Дзяржаўным рэестры вертадромаў грамадзянскай авіяцыі Рэспублікі Беларусь забараняецца.

Эксплуатацыя аэрадрома (вертадрома) грамадзянскай авіяцыі, аэрадрома (вертадрома) сумеснага базавання і аэрадрома (вертадрома) сумеснага выкарыстання і ажыццяўленне аэрапортнай дзейнасці без адпаведнага сертыфіката або з пратэрмінаваным сертыфікатам забараняюцца.

Эксплуатацыя пасадачных пляцовак павінна ажыццяўляцца ў адпаведнасці з авіяцыйнымі правіламі.

Пасадачныя пляцоўкі грамадзянскай авіяцыі павінны адпавядаць патрабаванням, што ўстанаўліваюцца авіяцыйнымі правіламі.

Паветраная перавозка пасажыраў або грузаў з пасадачных пляцовак грамадзянскай авіяцыі забараняецца.

Парадак ажыццяўлення аэрапортнай дзейнасці, а таксама патрабаванні да яе ажыццяўлення вызначаюцца авіяцыйнымі правіламі і іншымі актамі заканадаўства.

Сертыфікат прыдатнасці аэрадрома (вертадрома) грамадзянскай авіяцыі, аэрадрома (вертадрома) сумеснага базавання і аэрадрома (вертадрома) сумеснага выкарыстання да эксплуатацыі і сертыфікат, на падставе якога ажыццяўляецца аэрапортная дзейнасць, могуць быць ануляваны або іх дзеянне можа быць прыпынена органам, які выдаў гэтыя сертыфікаты, у выпадку неадпаведнасці аэрадрома (вертадрома) грамадзянскай авіяцыі, аэрадрома (вертадрома) сумеснага базавання і аэрадрома (вертадрома) сумеснага выкарыстання патрабаванням па эксплуатацыі або парушэння патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да ажыццяўлення аэрапортнай дзейнасці, устаноўленых авіяцыйнымі правіламі.

Кантроль за адпаведнасцю ў працэсе эксплуатацыі аэрадромаў (вертадромаў) грамадзянскай авіяцыі, аэрадромаў (вертадромаў) сумеснага базавання і аэрадромаў (вертадромаў) сумеснага выкарыстання патрабаванням, якія прад'яўляюцца да іх, з'яўляецца часткай кантролю за бяспекай палётаў паветраных суднаў і авіяцыйнай бяспекай у галіне грамадзянскай авіяцыі і ажыццяўляецца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі, а таксама створанымі ім інспектарскімі органамі.

**Артыкул 51. Выключэнне аэрадрома (вертадрома) з адпаведнага дзяржаўнага рэестра аэрадромаў (вертадромаў)**

Аэрадром (вертадром) выключаецца з адпаведнага дзяржаўнага рэестра аэрадромаў (вертадромаў) у выпадках, устаноўленых заканадаўствам.

У выпадку выключэння аэрадрома (вертадрома) з адпаведнага дзяржаўнага рэестра аэрадромаў (вертадромаў) пасведчанне аб яго рэгістрацыі страчвае сілу, а эксплуатант аэрадрома (вертадрома) – права на яго эксплуатацыю.

**Артыкул 52. Маркіроўка аэрадромаў (вертадромаў) і пасадачных пляцовак**

Аэрадром (вертадром) (узлётна-пасадачная паласа, рулёжныя дарожкі і іншыя яго элементы), а таксама пасадачныя пляцоўкі падлягаюць маркіроўцы ў адпаведнасці з патрабаваннямі, устаноўленымі авіяцыйнымі правіламі.

Размяшчэнне на прыаэрадромнай тэрыторыі любых знакаў, прылад і адзнак, падобных да маркіровачных знакаў, прылад і адзнак, якія выкарыстоўваюцца для распазнавання аэрадромаў (вертадромаў), забараняецца.

**Артыкул 53. Маркіроўка нерухомых аб'ектаў і збудаванняў**

Нерухомыя аб'екты і збудаванні, размешчаныя на прыаэрадромнай тэрыторыі і за яе межамі, павінны быць маркіраваны дзённымі і начнымі маркіровачнымі знакамі,

прыладамі і адзнакамі ў адпаведнасці з патрабаваннямі, устаноўленымі Правіламі выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь і авіяцыйнымі правіламі.

Маркіроўка нерухомых аб'ектаў і збудаванняў дзённымі і начнымі маркіровачнымі знакамі, прыладамі і адзнакамі праводзіцца ўладальнікамі гэтых аб'ектаў і збудаванняў за кошт уласных сродкаў.

Адказнасць за спраўнасць і своечасовасць уключэння начных маркіровачных знакаў, прылад і адзнак, якія выкарыстоўваюцца для распазнавання нерухомых аб'ектаў і збудаванняў, размешчаных на прыаэрадромнай тэрыторыі і за яе межамі, ускладаецца на ўладальнікаў гэтых аб'ектаў і збудаванняў.

## ГЛАВА 8
## КАМЕРЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У ГАЛІНЕ АВІЯЦЫІ

### Артыкул 54. Камерцыйная дзейнасць у галіне авіяцыі авіяцыйных арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, зарэгістраваных у Рэспубліцы Беларусь

Авіяцыйныя арганізацыі, індывідуальныя прадпрымальнікі, зарэгістраваныя ў Рэспубліцы Беларусь, маюць права ажыццяўляць камерцыйную дзейнасць у галіне авіяцыі ў адпаведнасці з заканадаўствам.

### Артыкул 55. Камерцыйная дзейнасць у галіне авіяцыі замежных суб'ектаў

Замежныя суб'екты маюць права ажыццяўляць камерцыйную дзейнасць у галіне авіяцыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, а таксама міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

У адносінах да замежнага суб'екта прызнаюцца правадзейнымі сертыфікат (пасведчанне) эксплуатанта паветранага судна або эквівалентны дакумент, выдадзены ўпаўнаважаным органам замежнай дзяржавы або міжнароднай арганізацыяй і адпавядае міжнародным стандартам, што прызнаюцца Рэспублікай Беларусь.

Замежныя суб'екты, якія ажыццяўляюць камерцыйную дзейнасць у галіне авіяцыі, маюць права:

прымаць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на борт паветраных суднаў пасажыраў, багаж, грузы і паштовыя адпраўленні для паветраных перавозак на тэрыторыю замежнай дзяржавы або перавозіць іх з тэрыторыі замежнай дзяржавы на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, калі гэта прадугледжана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь або разавым дазволам на выкананне міжнароднага палёту паветранага судна спецыяльна ўпаўнаважанага органа ў галіне грамадзянскай авіяцыі або спецыяльна ўпаўнаважанага органа ў галіне абароны, які выдаецца ў парадку, які вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

прымаць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на борт паветраных суднаў пасажыраў, багаж, грузы і паштовыя адпраўленні для паветраных перавозак у межах тэрыторыі Рэспублікі Беларусь па дазволе спецыяльна ўпаўнаважанага органа ў галіне грамадзянскай авіяцыі.

### Артыкул 56. Выключаны

## ГЛАВА 9
## ПАЛЁТЫ ПАВЕТРАНЫХ СУДНАЎ

### Артыкул 57. Арганізацыя і выкананне палётаў паветраных суднаў

Парадак арганізацыі палётаў паветраных суднаў вызначаецца авіяцыйнымі правіламі.

Выкананне палётаў паветраных суднаў у паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь рэгламентуецца Правіламі выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь і авіяцыйнымі правіламі.

У выпадку адступлення ад устаноўленых Правіламі выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь і авіяцыйнымі правіламі патрабаванняў выканання палётаў паветраных суднаў пры ўзнікненні ў палёце экстрэмальнай сітуацыі, якая пагражае гібеллю грамадзян, для ратавання іх жыцця камандзір паветранага судна, аператар беспілотнага лятальнага апарата абавязаны неадкладна паведаміць аб прынятым рашэнні органу абслугоўвання паветранага руху і кіравання палётамі, з якім камандзір паветранага судна, аператар беспілотнага лятальнага апарата ажыццяўляюць радыёсувязь.

**Артыкул 58. Лiтарныя палёты**

Лiтарныя палёты ў паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь ажыццяўляюцца ў парадку, які вызначаецца актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 59.Выключаны**

**Артыкул 60. Допуск паветранага судна да палёту**

Паветранае судна дапускаецца да палёту, калі яно мае неабходныя знакі і нумары, спраўнае, прайшло неабходную падрыхтоўку да палёту і мае на борце неабходную бартавую дакументацыю, а грамадзянскае беспілотнае паветранае судна, дзяржаўны беспілотны лятальны апарат, эксперыментальны беспілотны лятальны апарат – пры наяўнасці адпаведнай дакументацыі на працоўным месцы знешняга пілота ці аператара беспілотнага лятальнага апарата, пералік якой устанаўліваецца авіяцыйнымі правіламі.

Парадак допуску паветраных суднаў да палётаў вызначаецца гэтым Кодэксам і авіяцыйнымі правіламі.

**Артыкул 61. Бартавая дакументацыя паветранага судна**

Грамадзянскае паветранае судна павінна мець на борце наступную дакументацыю:

суднавыя дакументы: рэгістрацыйнае пасведчанне, копію сертыфіката эксплуатанта паветранага судна, сертыфікат лётнай прыдатнасці (пасведчанне аб прыдатнасці да палётаў), бартавы і санітарны журналы, дазвол на бартавую радыёстанцыю, калі паветранае судна абсталявана радыёапаратурай, інструкцыю па лётнай эксплуатацыі;

дакументы на кожнага члена экіпажа паветранага судна ў адпаведнасці з заканадаўствам, у тым ліку авіяцыйнымі правіламі;

іншыя дакументы, прадугледжаныя спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі.

Эксперыментальнае і дзяржаўнае паветраныя судны павінны мець на борце дакументы, пералік якіх вызначаецца авіяцыйнымі правіламі.

**Артыкул 62. Падрыхтоўка паветранага судна і экіпажа паветранага судна, аператара беспілотнага лятальнага апарата да палёту**

Палёту паветранага судна павінна папярэднічаць падрыхтоўка паветранага судна і экіпажа паветранага судна, аператара беспілотнага лятальнага апарата.

Парадак падрыхтоўкі паветранага судна і экіпажа паветранага судна, аператара беспілотнага лятальнага апарата да палёту, а таксама парадак кантролю за гэтай падрыхтоўкай вызначаюцца авіяцыйнымі правіламі.

**Артыкул 63. Арганізацыя забеспячэння палётаў паветраных суднаў**

Парадак арганізацыі забеспячэння палётаў грамадзянскіх, эксперыментальных і дзяржаўных паветраных суднаў вызначаецца авіяцыйнымі правіламі і іншымі актамі заканадаўства.

**Артыкул 64. План палёту грамадзянскага паветранага судна**

Палёт грамадзянскага паветранага судна выконваецца ў адпаведнасці з планам палёту, прадстаўленым карыстальнікам паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь адпаведнаму органу Адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху пры наяўнасці дазволу на выкарыстанне паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, за выключэннем палётаў, якія выконваюцца ў выпадках, прадугледжаных абзацамі трэцім–пятым часткі другой артыкула 9 гэтага Кодэкса.

Адступленне ад плана палёту грамадзянскага паветранага судна дапускаецца на падставе дазволу адпаведнага органа абслугоўвання паветранага руху і кіравання палётамі, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных абзацамі другім, шостым і сёмым часткі першай артыкула 43 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 65. Палёт паветранага судна над населенымі пунктамі**

Палёт паветранага судна над населенымі пунктамі павінен выконвацца на вышыні, якая дазваляе ў выпадку няспраўнасці паветранага судна зрабіць пасадку за межамі населеных пунктаў або на спецыяльна прадугледжаных для гэтых мэт пасадачных пляцоўках у межах населеных пунктаў, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

**Артыкул 66. Дэманстрацыйны палёт паветранага судна**

Дэманстрацыйны палёт паветранага судна выконваецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі бяспекі палётаў паветраных суднаў, устаноўленымі спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі, спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне эксперыментальнай авіяцыі і спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне абароны.

Парадак арганізацыі і выканання дэманстрацыйных палётаў паветраных суднаў вызначаецца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі, спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне эксперыментальнай авіяцыі і спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне абароны.

**Артыкул 67. Абарона грамадзян і ахова навакольнага асяроддзя ад шкоднага ўздзеяння палётаў паветраных суднаў**

Грамадзянскае паветранае судна, якое эксплуатуецца ў Рэспубліцы Беларусь, павінна мець сертыфікаты, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і авіяцыйнымі правіламі, у тым ліку адносна ўзроўню шумаў на мясцовасці, звязаных з эксплуатацыяй паветранага судна, а таксама выкідаў забруджвальных рэчываў авіяцыйнымі рухавікамі.

Эксплуатанты аэрадромаў (вертадромаў), пасадачных пляцовак, эксплуатанты паветраных суднаў, камандзіры і члены экіпажаў паветраных суднаў абавязаны прымаць меры для зніжэння ўзроўню шумаў пры эксплуатацыі паветраных суднаў на зямлі і ў паветры.

З мэтай абароны грамадзян і аховы навакольнага асяроддзя на тэрыторыях, прылеглых да аэрадромаў грамадзянскай авіяцыі, на якіх размешчаны аб'екты, што з'яўляюцца крыніцамі выкідаў або скідаў забруджвальных рэчываў і іншага шкоднага

ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, у адпаведнасці з заканадаўствам устанаўліваюцца санітарна-ахоўныя зоны.

З мэтай папярэджання шкоднага ўздзеяння палётаў паветраных суднаў на грамадзян і аб'екты навакольнага асяроддзя ў пэўных раёнах можа ўстанаўлівацца мінімальная вышыня палёту паветраных суднаў у парадку, які вызначаецца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі, спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне эксперыментальнай авіяцыі і спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне абароны.

**Артыкул 68. Палёт паветранага судна са звышгукавой хуткасцю**

Парадак выканання палётаў паветраных суднаў са звышгукавой хуткасцю вызначаецца Правіламі выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь і авіяцыйнымі правіламі.

**Артыкул 69. Аказанне паслуг электрасувязі**

Для забеспячэння палётаў паветраных суднаў і іншай дзейнасці, звязанай з выкарыстаннем паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, аператары электрасувязі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, аказваюць спецыяльна ўпаўнаважанаму органу ў галіне грамадзянскай авіяцыі, спецыяльна ўпаўнаважанаму органу ў галіне эксперыментальнай авіяцыі, спецыяльна ўпаўнаважанаму органу ў галіне абароны, а таксама іншым дзяржаўным органам і арганізацыям, якія маюць падраздзяленні авіяцыі, па іх заяўках неабходныя паслугі электрасувязі.

Спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне электрасувязі, а таксама аператары электрасувязі аказваюць у першачарговым парадку паслугі электрасувязі для забеспячэння палётаў паветраных суднаў і іншай дзейнасці, звязанай з выкарыстаннем паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, і прымаюць неадкладныя меры для аднаўлення электрасувязі.

**Артыкул 70. Радыётэхнічнае забеспячэнне палётаў і авіяцыйная электрасувязь грамадзянскай і эксперыментальнай авіяцыі**

Радыётэхнічнае забеспячэнне палётаў і авіяцыйная электрасувязь грамадзянскай і эксперыментальнай авіяцыі з'яўляюцца комплексам арганізацыйных і тэхнічных мерапрыемстваў, якія ажыццяўляюцца адпаведнымі службамі авіяцыйных арганізацый, іншых арганізацый, накіраваных на забеспячэнне надзейнасці функцыянавання радыёэлектронных сродкаў і высокачастотных прылад у працэсе арганізацыі, абслугоўвання паветранага руху і кіравання палётамі.

Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да радыётэхнічнага забеспячэння палётаў і авіяцыйнай электрасувязі грамадзянскай і эксперыментальнай авіяцыі, устанаўліваюцца авіяцыйнымі правіламі і абавязковыя для выканання арганізацыямі і грамадзянамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія бяруць удзел у стварэнні, выпрабаванні, серыйнай вытворчасці, прыёмцы, эксплуатацыі, рамонце, мадэрнізацыі, пераабсталяванні і мадыфікацыі сродкаў радыётэхнічнага забеспячэння палётаў і авіяцыйнай электрасувязі.

Сродкі радыётэхнічнага забеспячэння палётаў і авіяцыйнай электрасувязі, якія выкарыстоўваюцца ў грамадзянскай авіяцыі, павінны адпавядаць патрабаванням прыдатнасці да эксплуатацыі і мець сертыфікат або іншы эквівалентны дакумент, які пацвярджае адпаведнасць тэхнічных параметраў сродкаў радыётэхнічнага забеспячэння палётаў і авіяцыйнай электрасувязі міжнародным стандартам, выдадзены кампетэнтным

органам Рэспублікі Беларусь, кампетэнтным органам замежнай дзяржавы або міжнароднай арганізацыяй.

**Артыкул 71. Радыёсувязь пры выкананні палёту паветранага судна**

Экіпажы паветраных суднаў, абсталяваных сродкамі радыёсувязі, аператар беспілотнага лятальнага апарата, экіпажы грамадзянскіх беспілотных паветраных суднаў, орган абслугоўвання паветранага руху і кіравання палётамі павінны ажыццяўляць радыёсувязь у адпаведнасці з авіяцыйнымі правіламі. Для сувязі аператара беспілотнага лятальнага апарата, знешняга пілота грамадзянскага беспілотнага паветранага судна з органам абслугоўвання паветранага руху і кіравання палётамі дапускаецца выкарыстоўваць іншыя сродкі і лініі электрасувязі.Для ажыццяўлення двухбаковай радыёсувязі сродкам радыёсувязі органаў абслугоўвання паветранага руху і кіравання палётамі ў адпаведнасці з заканадаўствам прысвойваюцца (прызначаюцца) неабходныя радыёчастоты або радыёчастотныя каналы, якія павінны быць абаронены ад перашкод.

Вядзенне радыёабмену органамі абслугоўвання паветранага руху і кіравання палётамі з экіпажамі паветраных суднаў у межах тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца на беларускай, рускай або англійскай мове.

Вядзенне радыёабмену на маршрутах абслугоўвання паветранага руху і аэрадромах грамадзянскай авіяцыі пры абслугоўванні міжнародных палётаў ажыццяўляецца на англійскай або рускай мове па запыце экіпажа.

**Артыкул 72. Меры, якія прымяняюцца да паветранага судна-парушальніка**

Да паветранага судна-парушальніка прымяняюцца меры, установленыя заканадаўствам, у тым ліку авіяцыйнымі правіламі.

## ГЛАВА 10
## МІЖНАРОДНЫЯ ПАЛЁТЫ ПАВЕТРАНЫХ СУДНАЎ

**Артыкул 73. Выкананне міжнародных палётаў паветраных суднаў**

Міжнародныя палёты паветраных суднаў у паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь выконваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам, а таксама міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, або на падставе дазволаў, якія выдаюцца ў парадку, што вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Аэранавігацыйная інфармацыя, неабходная для выканання міжнародных палётаў паветраных суднаў, публікуецца ў дакументах аэранавігацыйнай інфармацыі ў парадку, установленым авіяцыйнымі правіламі.

Апазнавальныя знакі грамадзянскіх паветраных суднаў замежных дзяржаў павінны перадавацца эксплуатантамі гэтых паветраных суднаў спецыяльна ўпаўнаважанаму органу ў галіне грамадзянскай авіяцыі да пачатку выканання міжнародных палётаў.

Для выканання міжнародных палётаў грамадзянскіх паветраных суднаў замежных дзяржаў у паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, за выключэннем паветраных суднаў, якія выкарыстоўваюцца для ажыццяўлення ваеннай, мытнай і паліцэйскай службы, эксплуатанты гэтых паветраных суднаў абавязаны прадставіць спецыяльна ўпаўнаважанаму органу ў галіне грамадзянскай авіяцыі звесткі аб страхаванні або аб іншым забеспячэнні адказнасці за прычыненне шкоды трэцім асобам і паветраным суднам. Умовы такога забеспячэння ўстанаўліваюцца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі.

**Артыкул 74. Узлёт і пасадка паветраных суднаў пры выкананні міжнародных палётаў паветраных суднаў**

Узлёт і пасадка паветраных суднаў пры выкананні міжнародных палётаў паветраных суднаў у паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь праводзяцца ў міжнародных аэрапортах і на адкрытых для міжнародных палётаў паветраных суднаў аэрадромах (вертадромах), а таксама на аэрадромах (вертадромах), не адкрытых для міжнародных палётаў паветраных суднаў, па дазволах спецыяльна ўпаўнаважанага органа ў галіне грамадзянскай авіяцыі або спецыяльна ўпаўнаважанага органа ў галіне абароны, якія выдаюцца ў парадку, які вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

У выдачы дазволаў, указаных у частцы першай гэтага артыкула, эксплуатанту паветранага судна можа быць адмоўлена ў выпадку парушэння патрабаванняў, устаноўленых гэтым Кодэксам, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 75. Прызнанне суднавых дакументаў, якія ёсць на борце паветраных суднаў замежных дзяржаў**

Суднавыя дакументы, якія ёсць на борце паветраных суднаў замежных дзяржаў, прызнаюцца правадзейнымі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, калі яны адпавядаюць міжнародным стандартам, якія прызнаюцца Рэспублікай Беларусь.

Паветраныя судны замежных дзяржаў пасля пасадкі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь могуць быць падвергнуты агляду і праверцы суднавых дакументаў службовымі асобамі спецыяльна ўпаўнаважаных органаў у адпаведнасці з заканадаўствам.

У выпадку, калі на борце грамадзянскага паветранага судна замежнай дзяржавы адсутнічаюць суднавыя дакументы, устаноўленыя ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, або маюцца падставы лічыць дадзенае паветранае судна няспраўным, спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне грамадзянскай авіяцыі мае права прыпыніць выкананне палёту гэтага паветранага судна да ліквідацыі выяўленай неадпаведнасці.

**Артыкул 76. Пагранічны, мытны і іншыя віды кантролю пры выкананні міжнародных палётаў паветраных суднаў**

Паветраныя судны, іх экіпажы і пасажыры, а таксама грузы і іншая маёмасць, якія перавозяцца гэтымі паветранымі суднамі, пры выкананні міжнародных палётаў паветраных суднаў, калі пункты адпраўлення або прызначэння размешчаны на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, падлягаюць пагранічнаму і мытнаму кантролю, а ў неабходных выпадках у парадку, устаноўленым заканадаўствам, ажыццяўляюцца іх санітарна-каранцінны і іншыя віды кантролю.

## ГЛАВА 11
## АВІЯЦЫЙНАЯ БЯСПЕКА

**Артыкул 77. Забеспячэнне авіяцыйнай бяспекі**

Авіяцыйная бяспека забяспечваецца пры дапамозе:

прадухілення несанкцыяніраванага доступу грамадзян і транспартных сродкаў у кантрольную зону авіяцыйнай арганізацыі, аэрапорта (аэрадрома (вертадрома)), іншых аб'ектаў авіяцыі і аб'ектаў Адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху;

аховы паветраных суднаў, аб'ектаў Адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху, палівазабеспячэння, энергазабеспячэння і іншых аб'ектаў авіяцыі;

прадухілення незаконнага правозу на паветраным судне зброі, боепрыпасаў, выбуховых, атрутных, лёгкіх на загаранне, радыеактыўных рэчываў, а таксама іншых небяспечных рэчываў, матэрыялаў і вырабаў, якія могуць быць выкарыстаны для здзяйснення акта незаконнага ўмяшання ў дзейнасць авіяцыі, і прыняцця асобых мер засцярогі пры іх правозе ў адпаведнасці з заканадаўствам;

правядзення надгляду пасажыраў, членаў экіпажа паветранага судна, багажу, у тым ліку рэчаў, якія знаходзяцца пры пасажырах, грузаў, паштовых адпраўленняў, бартавых запасаў паветранага судна;

стварэння падраздзяленняў авіяцыйнай бяспекі ў спецыяльна ўпаўнаважаным органе ў галіне грамадзянскай авіяцыі і авіяцыйных арганізацыях;

прыняцця іншых мер папярэджання, прадухілення і процідзеяння актам незаконнага ўмяшання ў дзейнасць авіяцыі і пераадолення (ліквідацыі) іх негатыўных наступстваў.

Арганізацыйныя і прававыя меры для абароны авіяцыі ад актаў незаконнага ўмяшання ў яе дзейнасць вызначаюцца Нацыянальнай праграмай абароны грамадзянскай авіяцыі ад актаў незаконнага ўмяшання, якая распрацоўваецца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі і якая зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, іншымі актамі заканадаўства.

**Артыкул 78. Надгляд з мэтай забеспячэння авіяцыйнай бяспекі**

Надгляд уключае ў сябе перадпалётны надгляд, асабісты надгляд і іншыя працэдуры кантролю, якія ажыццяўляюцца ў мэтах забеспячэння авіяцыйнай бяспекі.

Перадпалётны надгляд ажыццяўляецца ў мэтах забеспячэння авіяцыйнай бяспекі і ў межах, неабходных для выяўлення рэчываў, матэрыялаў і вырабаў, якія могуць быць выкарыстаны для здзяйснення акта незаконнага ўмяшання ў дзейнасць авіяцыі, калі іншае не ўстаноўлена законамі.

Перадпалётны надгляд ажыццяўляецца службовымі асобамі падраздзяленняў авіяцыйнай бяспекі авіяцыйных арганізацый з удзелам прадстаўнікоў органаў унутраных спраў.

Перадпалётны надгляд членаў экіпажа паветранага судна, пасажыраў, багажу, у тым ліку рэчаў, якія знаходзяцца пры пасажырах, а таксама грузаў, паштовых адпраўленняў, бартавых запасаў паветранага судна ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

Асабісты надгляд грамадзяніна ажыццяўляецца пры наяўнасці дастатковых падстаў меркаваць, што ён мае пры сабе рэчывы, матэрыялы і вырабы, якія могуць быць выкарыстаны для здзяйснення акта незаконнага ўмяшання ў дзейнасць авіяцыі.

Асабісты надгляд грамадзяніна ажыццяўляецца ў ізаляваным памяшканні ўпаўнаважанай на тое службовай асобай падраздзялення авіяцыйнай бяспекі авіяцыйнай арганізацыі аднаго полу з асобай, якая надглядаецца, і ў прысутнасці двух панятых таго ж полу, за выключэннем выпадкаў, калі немагчыма забяспечыць прысутнасць панятых, а таксама па рашэнні камандзіра паветранага судна ў палёце ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Парадак ажыццяўлення надгляду і іншых працэдур кантролю ў мэтах забеспячэння авіяцыйнай бяспекі вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 78[1]. Даванне персанальных даных пасажыраў паветраных суднаў і іншай інфармацыі аб перавозцы пасажыраў**

З мэтай забеспячэння авіяцыйнай бяспекі і інфармавання перавозчыкаў, якія ажыццяўляюць міжнародныя паветраныя перавозкі пасажыраў, аб пасажырах, якім будзе адмоўлена ва ўездзе ў Рэспубліку Беларусь або іншую дзяржаву, якая з'яўляецца дзяржавай прызначэння або транзіту, перавозчыкі забяспечваюць перадачу персанальных даных пасажыраў паветраных суднаў, якія пакідаюць і якія накіроўваюцца ў Рэспубліку Беларусь, і іншай інфармацыі аб перавозцы пасажыраў у інфармацыйныя сістэмы Міністэрства транспарту і камунікацый у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, а пры ажыццяўленні міжнародных паветраных перавозак пасажыраў – таксама ва ўпаўнаважаныя органы замежных дзяржаў у адпаведнасці з

міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь або заканадаўствам замежных дзяржаў, якія з'яўляюцца дзяржавамі адпраўлення, прызначэння або транзіту.

Прадугледжаная часткай першай гэтага артыкула перадача персанальных даных пасажыраў ажыццяўляецца без іх згоды.

Парадак стварэння, эксплуатацыі, развіцця і абслугоўвання інфармацыйных сістэм Міністэрства транспарту і камунікацый, указаных у частцы першай гэтага артыкула, а таксама інфармавання перавозчыкаў, якія ажыццяўляюць міжнародныя паветраныя перавозкі пасажыраў, аб пасажырах, якім будзе адмоўлена ва ўездзе ў Рэспубліку Беларусь, вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 12
## БЯСПЕКА ПАЛЁТАЎ ПАВЕТРАНЫХ СУДНАЎ

### Артыкул 79. Забеспячэнне бяспекі палётаў паветраных суднаў

У забеспячэнні бяспекі палётаў паветраных суднаў і папярэджанні авіяцыйных падзей абавязаны прымаць удзел арганізацыі і грамадзяне, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, якія займаюцца распрацоўкай, вытворчасцю, эксплуатацыяй, абслугоўваннем і рамонтам авіяцыйнай тэхнікі, арганізацыяй выкарыстання паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, абслугоўваннем паветранага руху і кіраваннем палётамі, а таксама іншымі работамі, звязанымі з дзейнасцю ў галіне авіяцыі.

Спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне грамадзянскай авіяцыі, спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне эксперыментальнай авіяцыі і спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне абароны праводзяць аналіз стану бяспекі палётаў паветраных суднаў адпаведна ў грамадзянскай, эксперыментальнай і дзяржаўнай авіяцыі.

### Артыкул 80. Паведамленне аб авіяцыйнай падзеі

Паведамленне аб авіяцыйнай падзеі перадаецца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь і авіяцыйнымі правіламі.

### Артыкул 81. Расследаванне авіяцыйных падзей

Авіяцыйныя падзеі падлягаюць расследаванню ў мэтах устанаўлення іх прычын і прыняцця мер для іх папярэджання.

Парадак расследавання авіяцыйных падзей вызначаецца авіяцыйнымі правіламі.

### Артыкул 82. Паўнамоцтвы камісіі па расследаванні авіяцыйнай падзеі

Парадак стварэння камісіі па расследаванні авіяцыйнай падзеі вызначаецца авіяцыйнымі правіламі.

Камісія па расследаванні авіяцыйнай падзеі мае права:

беспарашкодна праходзіць на борт паветранага судна, з якім адбылася авіяцыйная падзея, для высвятлення абставін авіяцыйнай падзеі;

абследаваць паветранае судна, з якім адбылася авіяцыйная падзея, складнікі паветранага судна, маёмасць, якая знаходзіцца на яго борце і ўцягнута ў авіяцыйную падзею звонку, а таксама сродкі і аб'екты забеспячэння палётаў паветраных суднаў;

даручаць у адпаведнасці з заканадаўствам арганізацыям і грамадзянам правядзенне даследаванняў і работ, якія звязаны з расследаваннем авіяцыйнай падзеі і патрабуюць ведаў у адпаведных галінах навукі і тэхнікі;

арганізоўваць выкананне неадкладных і іншых работ, звязаных з расследаваннем авіяцыйнай падзеі;

апытваць відавочцаў авіяцыйнай падзеі, а таксама іншых грамадзян, якія маюць або могуць мець дачыненне да авіяцыйнай падзеі, атрымліваць неабходную інфармацыю ад праваахоўных і іншых дзяржаўных органаў у адпаведнасці з заканадаўствам;

патрабаваць і атрымліваць у адпаведнасці з заканадаўствам ад адпаведных арганізацый і грамадзян дакументы і матэрыялы па пытаннях, звязаных з дадзенай авіяцыйнай падзеяй;

вывучаць пытанні распрацоўкі, выпрабаванняў, вытворчасці, эксплуатацыі і рамонту паветранага судна, з якім адбылася авіяцыйная падзея, падрыхтоўкі авіяцыйнага персаналу, арганізацыі паветранага руху, выканання і забеспячэння палётаў паветраных суднаў;

арганізоўваць правядзенне ў адпаведнасці з заканадаўствам даследаванняў псіхафізіялагічнага стану членаў экіпажа паветранага судна, з якім адбылася авіяцыйная падзея, а таксама адпаведнага авіяцыйнага персаналу.

Члены камісіі па расследаванні авіяцыйнай падзеі, а таксама грамадзяне, якія прыцягваюцца для расследавання авіяцыйнай падзеі, пры прад'яўленні камандзіровачных пасведчанняў або іншых дакументаў, якія пацвярджаюць іх удзел у рабоце камісіі па расследаванні авіяцыйнай падзеі, маюць права пазачарговага набыцця білетаў на праезд у транспарце агульнага карыстання пры руху да месца авіяцыйнай падзеі або пераездах з мэтай яго расследавання.

**Артыкул 83. Захаванне матэрыялаў, звязаных з авіяцыйнай падзеяй**

Члены экіпажа паветранага судна, з якім адбылася авіяцыйная падзея, арганізацыі і грамадзяне, на зямельным участку якіх адбылася авіяцыйная падзея, да прыбыцця камісіі па расследаванні авіяцыйнай падзеі абавязаны прыняць неабходныя меры для забеспячэння захаванасці паветранага судна, яго складнікаў і абломкаў, бартавых і наземных сродкаў аб'ектыўнага кантролю, прадметаў, якія знаходзяцца на яго борце або ўцягнуты ў авіяцыйную падзею звонку, а таксама дакументацыі, якая адносіцца да распрацоўкі, выпрабаванняў, вытворчасці, рамонту і эксплуатацыі гэтага паветранага судна і забеспячэння яго палёту.

Арганізацыі і грамадзяне, вінаватыя ў наўмысным утойванні авіяцыйнай падзеі, звестак аб ёй, скажэнні інфармацыі, пашкоджанні або знішчэнні бартавых і наземных сродкаў аб'ектыўнага кантролю і іншых звязаных з авіяцыйнай падзеяй матэрыялаў, нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 84. Работы, якія праводзяцца на месцы авіяцыйнай падзеі**

Расследаванне, якое праводзіцца на месцы авіяцыйнай падзеі, адносіцца да катэгорыі работ у асаблівых умовах, якія прыраўноўваюцца да работ па ліквідацыі надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару.

Спецыялісты, якія працуюць на месцы авіяцыйнай падзеі, павінны забяспечвацца спецыяльнымі адзеннем, абуткам, рыштункам і ахоўнымі сродкамі зыходзячы з канкрэтных умоў работы.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы абавязаны аказваць камісіі па расследаванні авіяцыйнай падзеі садзейнічанне ў ахове месца авіяцыйнай падзеі, пошуку складнікаў і абломкаў паветранага судна, якое пацярпела бедства, забеспячэнні транспартам, сродкамі сувязі, памяшканнямі для работы і адпачынку, харчаваннем, спецыяльнымі адзеннем, абуткам, рыштункам, ахоўнымі сродкамі, а таксама сродкамі для выканання такелажных, грузавых работ, санітарнай апрацоўкі мясцовасці і іншых прыродаахоўных мерапрыемстваў.

**Артыкул 85. Фінансаванне работ, звязаных з расследаваннем авіяцыйнай падзеі**

Расходы, звязаныя з расследаваннем авіяцыйнай падзеі, якое праводзіцца на месцы авіяцыйнай падзеі, фінансуюцца эксплуатантам паветранага судна, з якім адбылася гэта авіяцыйная падзея.

Даследаванні і выпрабаванні, якія праводзяцца навукова-даследчымі, канструктарскімі, рамонтнымі і іншымі арганізацыямі, звязаныя з расследаваннем авіяцыйнай падзеі, фінансуюцца за кошт сродкаў гэтых арганізацый з пакрыццём ім расходаў эксплуатантам паветранага судна, з якім адбылася гэта авіяцыйная падзея.

**Артыкул 86. Папярэджанне авіяцыйных падзей**

Камісія па расследаванні авіяцыйнай падзеі на падставе сваіх высноў і заключэння абавязана выпрацаваць рэкамендацыі па ліквідацыі прычын авіяцыйнай падзеі.

Спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне грамадзянскай авіяцыі, спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне эксперыментальнай авіяцыі і спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне абароны на падставе аналізу стану бяспекі палётаў паветраных суднаў, рэкамендацый камісіі па расследаванні авіяцыйнай падзеі распрацоўваюць план мерапрыемстваў па прадухіленні аналагічных авіяцыйных падзей і накіроўваюць яго карыстальнікам паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, а таксама зацікаўленым арганізацыям і грамадзянам для абавязковай рэалізацыі ва ўстаноўленыя тэрміны.

**Артыкул 87. Улік авіяцыйных падзей і прадстаўленне звестак па бяспецы палётаў паветраных суднаў**

Улік авіяцыйных падзей, якія адбыліся з паветранымі суднамі Рэспублікі Беларусь і паветранымі суднамі замежных дзяржаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляюць спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне грамадзянскай авіяцыі, спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне эксперыментальнай авіяцыі і спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне абароны.

Звесткі па бяспецы палётаў паветраных суднаў прадстаўляюцца ў міжнародныя арганізацыі ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 13
## ПОШУКАВАЕ І АВАРЫЙНА-ВЫРАТАВАЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПАЛЁТАЎ ПАВЕТРАНЫХ СУДНАЎ

**Артыкул 88. Паветранае судна, якое церпіць або пацярпела бедства**

Паветраным суднам, якое церпіць бедства, прызнаецца паветранае судна, жыццю і (або) здароўю пасажыраў і членаў экіпажа якога пагражае непасрэдная небяспека або з якім страчана сувязь і яго месцазнаходжанне невядома.

Паветраным суднам, якое пацярпела бедства, прызнаецца паветранае судна, разбуранае або якое атрымала пашкоджанне пры руленні, узлёце, палёце або пасадцы, а таксама паветранае судна, якое ажыццявіла вымушаную пасадку па-за аэрадромам (вертадромам), пасадачнай пляцоўкай.

Паветранае судна, якое церпіць або пацярпела бедства (за выключэннем дзяржаўнага беспілотнага лятальнага апарата, эксперыментальнага беспілотнага лятальнага апарата, грамадзянскага беспілотнага паветранага судна, якое не перавозіць людзей), падлягае неадкладнаму пошуку і ратаванню.

**Артыкул 89. Сігналы бедства, тэрміновасці і папярэджання аб небяспецы**

Для своечасовага выяўлення паветраных суднаў, якія церпяць або пацярпелі бедства, і аказання дапамогі пасажырам і членам іх экіпажаў прымяняюцца адзіныя міжнародныя сігналы бедства, тэрміновасці і папярэджання аб небяспецы.

Экіпаж паветранага судна, якое церпіць або пацярпела бедства, павінен падаваць пры магчымасці адпаведныя сігналы бедства, тэрміновасці або папярэджання аб

небяспецы з выкарыстаннем сродкаў радыёсувязі на аварыйных радыёчастотах, устаноўленых Рэгламентам радыёсувязі Міжнароднага саюза электрасувязі.

Аператар беспілотнага лятальнага апарата, знешні пілот грамадзянскага беспілотнага паветранага судна, якія церпяць бедства, павінны падаваць адпаведныя сігналы бедства, неадкладна паведаміць аб гэтым органу абслугоўвання паветранага руху і кіравання палётамі з абавязковым паведамленнем аб апошнім дакладным месцазнаходжанні і кірунку руху беспілотнага лятальнага апарата, беспілотнага паветранага судна.

Пры выкананні міжнародных палётаў паветраных суднаў сігналы бедства, тэрміновасці і папярэджання аб небяспецы дублююцца на міжнароднай радыёчастаце, прысвоенай (прызначанай) для падачы гэтых сігналаў.

**Артыкул 90. Паведамленні аб паветраным судне, якое церпіць або пацярпела бедства**

Арганізацыі і грамадзяне абавязаны неадкладна паведаміць мясцовым выканаўчым і распарадчым органам і (або) органам унутраных спраў вядомую ім інфармацыю аб паветраным судне, якое церпіць або пацярпела бедства, для перадачы яе дзяржаўнай авіяцыйнай аварыйна-выратавальнай арганізацыі.

**Артыкул 91. Пошукавыя і аварыйна-выратавальныя работы**

У адпаведнасці з міжнароднымі абавязацельствамі ў Рэспубліцы Беларусь функцыянуе адзіная сістэма авіяцыйнага пошуку і ратавання.

Пошук і ратаванне пасажыраў і экіпажаў паветраных суднаў, якія церпяць або пацярпелі бедства, з'яўляюцца бязвыплатнымі.

Каардынацыю, арганізацыю і правядзенне мерапрыемстваў па пошуку і выратаванні пасажыраў і экіпажаў паветраных суднаў, якія церпяць або пацярпелі бедства, ажыццяўляе дзяржаўная авіяцыйная аварыйна-выратавальная арганізацыя.

Парадак дзейнасці дзяржаўнай авіяцыйнай аварыйна-выратавальнай арганізацыі ўстанаўлівае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

Правядзенне пошукавых і аварыйна-выратавальных работ на аэрадроме (вертадроме) і ў яго раёне забяспечваюць спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне грамадзянскай авіяцыі, спецыяльна ўпаўнаважаны орган у галіне абароны па прыналежнасці аэрадрома (вертадрома), а таксама падначаленыя ім арганізацыі, на якія ў адпаведнасці з заканадаўствам ускладзены абавязкі па фарміраванні і ўтрыманні службаў пошуку і ратавання.Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ў межах іх кампетэнцыі, арганізацыі і грамадзяне, на зямельным участку якіх паветранае судна пацярпела бедства, абавязаны да прыбыцця прадстаўнікоў дзяржаўнай авіяцыйнай аварыйна-выратавальнай арганізацыі прыняць неадкладныя меры для ратавання грамадзян, аказання ім медыцынскай і іншай дапамогі, аховы паветранага судна і змешчаных на яго борце дакументацыі, абсталявання і маёмасці, а таксама для захавання стану месца авіяцыйнай падзеі.

Паветранаму судну, якое церпіць або пацярпела бедства, аказваецца дапамога незалежна ад яго дзяржаўнай прыналежнасці і абставін авіяцыйнай падзеі.

Спецыялісты рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і арганізацый, у абавязкі якіх уваходзіць выкананне мерапрыемстваў па пошуку і ратаванні пасажыраў і экіпажаў паветраных суднаў, якія церпяць або якія пацярпелі бедства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, праходзяць падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі для правядзення пошукавых і аварыйна-выратавальных работ ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь, іншых арганізацыях сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама ў замежных арганізацыях, якія маюць адпаведны міжнародны (замежны) сертыфікат, прызнаны ў Рэспубліцы Беларусь.

Спецыялісты рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і арганізацый, якія прыцягваюцца для выканання мерапрыемстваў па пошуку і ратаванні пасажыраў і экіпажаў паветраных суднаў, якія церпяць або якія пацярпелі бедства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з міжнародна-прававымі актамі , якія змяшчаюць абавязацельствы Рэспублікі Беларусь, і актамі заканадаўства праходзяць трэніроўкі для правядзення пошукавых і аварыйна-выратавальных работ.

Фінансаванне трэніровак, падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі спецыялістаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і арганізацый для правядзення пошукавых і аварыйна-выратавальных работ ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прадугледжаных на ўтрыманне гэтых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і арганізацый.

Эвакуацыя паветранага судна або яго частак з месца авіяцыйнай падзеі ажыццяўляецца сіламі і сродкамі эксплуатанта гэтага паветранага судна або іншымі арганізацыямі і грамадзянамі за кошт сродкаў эксплуатанта паветранага судна, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 92. Супрацоўніцтва з замежнымі дзяржавамі пры правядзенні пошукавых і аварыйна-выратавальных работ**

Пошук і ратаванне пасажыраў і экіпажа паветранага судна, якое церпіць або пацярпела бедства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і за яе межамі, ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, актамі заканадаўства замежнай дзяржавы, на тэрыторыі якой праводзяцца пошукавыя і аварыйна-выратавальныя работы. Каардынацыю гэтых дзеянняў са службамі пошуку і ратавання замежных дзяржаў ажыццяўляе дзяржаўная авіяцыйная аварыйна-выратавальная арганізацыя.

Пагадненні аб супрацоўніцтве і ўзаемадзеянні ў галіне пошуку і ратавання са службамі пошуку і ратавання замежных дзяржаў заключаюцца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства.

**Артыкул 93. Аснашчэнне паветранага судна і падрыхтоўка яго экіпажа на выпадак авіяцыйнай падзеі**

Паветранае судна павінна быць аснашчана бартавымі аварыйна-выратавальнымі сродкамі, пералік якіх у залежнасці ад тыпу паветранага судна і раёна палёту вызначаецца спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне грамадзянскай авіяцыі, спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне эксперыментальнай авіяцыі і спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне абароны.

Члены экіпажа паветранага судна абавязаны прайсці трэніроўку па праграме аварыйна-выратавальнай падрыхтоўкі і аказанні дапамогі пасажырам пры ўзнікненні на борце паветранага судна авіяцыйнай падзеі ў розных фізіка-геаграфічных і кліматычных умовах, а пасажыры павінны быць праінструктаваны экіпажам паветранага судна аб дзеяннях у такіх сітуацыях і правілах карыстання бартавымі аварыйна-выратавальнымі сродкамі.

## ГЛАВА 14
## ПАВЕТРАНЫЯ ПЕРАВОЗКІ

**Артыкул 94. Правілы паветраных перавозак**

Перавозчык, а таксама іншыя ўпаўнаважаныя ім арганізацыі і грамадзяне пры выкананні паветраных перавозак абавязаны выконваць правілы паветраных перавозак пасажыраў, багажу, грузаў і паштовых адпраўленняў, устаноўленыя заканадаўчымі актамі і авіяцыйнымі правіламі.

Перавозчык можа ўстанаўліваць свае правілы паветраных перавозак, якія не павінны супярэчыць правілам паветраных перавозак, устаноўленым заканадаўчымі актамі і авіяцыйнымі правіламі, і пагаршаць устаноўленыя гэтымі правіламі ўмовы і нормы абслугоўвання пасажыраў, грузаадпраўшчыкаў і грузаатрымальнікаў.

Грузы і паштовыя адпраўленні прымаюцца да паветранай перавозкі ад грузаадпраўшчыкаў і аператараў паштовай сувязі, якія прадставілі перавозчыку пісьмовыя гарантыі бяспекі гэтых адпраўленняў.

Правілы паветраных перавозак паштовых адпраўленняў павінны быць узгоднены са спецыяльна ўпаўнаважаным органам у галіне паштовай сувязі.

**Артыкул 95. Дагаворы паветранай перавозкі**

Паводле дагавора паветранай перавозкі пасажыра перавозчык абавязваецца перавезці пасажыра паветранага судна ў пункт прызначэння з даваннем яму месца на паветраным судне, якое здзяйсняе рэйс, указаны ў білеце, а ў выпадку паветранай перавозкі пасажырам багажу – даставіць гэты багаж у пункт прызначэння і выдаць яго пасажыру або асобе, упаўнаважанай на атрыманне багажу. Пасажыр паветранага судна абавязваецца аплаціць паветраную перавозку, а пры наяўнасці ў яго багажу, у тым ліку рэчаў, якія знаходзяцца пры ім, звыш устаноўленай перавозчыкам нормы бясплатнага правозу багажу – і правоз гэтага багажу.

Тэрмін дастаўкі пасажыра і багажу паводле дагавора паветранай перавозкі пасажыра вызначаецца ў адпаведнасці з правіламі паветраных перавозак.

Паводле дагавора паветранай перавозкі грузу перавозчык абавязваецца даставіць дavailable яму грузаадпраўшчыкам груз або паштовыя адпраўленні ў пункт прызначэння і выдаць іх грузаатрымальніку або асобе, упаўнаважанай на атрыманне грузу або паштовых адпраўленняў, а грузаадпраўшчык абавязваецца аплаціць паветраную перавозку грузаў або паштовых адпраўленняў.

**Артыкул 96. Дагавор фрахтавання паветранага судна (паветраны чартар)**

Паводле дагавора фрахтавання паветранага судна (паветраным чартары) адзін бок (фрахтоўшчык) абавязваецца даць другому боку (фрахтавальніку) за плату для выканання аднаго або некалькіх рэйсаў усю або частку ўмяшчальнасці паветранага судна (паветраных суднаў) для паветраных перавозак.

**Артыкул 97. Перавозачныя дакументы**

Да перавозачных дакументаў адносіцца білет, багажная квітанцыя, грузавая накладная, паштовая накладная, іншыя дакументы, якія выкарыстоўваюцца пры аказанні паслуг па паветранай перавозцы пасажыраў, багажу, грузу, паштовых адпраўленняў, вызначаныя авіяцыйнымі правіламі.

Дагавор паветранай перавозкі пасажыра сведчыцца білетам, а таксама багажнай квітанцыяй у выпадку перавозкі пасажырам багажу. Дагавор паветранай перавозкі грузу сведчыцца грузавой або паштовай накладной.

Білет, багажная квітанцыя, іншыя дакументы, якія выкарыстоўваюцца пры аказанні паслуг па паветранай перавозцы пасажыраў, грузавая накладная могуць быць афармлены ў электронным выглядзе з размяшчэннем інфармацыі ў аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэме афармлення паветраных перавозак. Пры афармленні перавозачнага дакумента ў электронным выглядзе па патрабаванні пасажыра пры заключэнні дагавора перавозкі яму павінна быць выдадзена завераная выпіска з аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы афармлення паветраных перавозак, якая ўтрымлівае ўмовы адпаведнага дагавора паветранай перавозкі.

Формы білета, багажнай квітанцыі, грузавой накладной і іншых дакументаў, якія выкарыстоўваюцца пры аказанні паслуг па паветранай перавозцы пасажыраў, багажу, грузу, паштовых адпраўленняў, за выключэннем паштовай накладной, вызначаюцца авіяцыйнымі правіламі.

Форма паштовай накладной устанаўліваецца актамі Сусветнага паштовага саюза.

**Артыкул 98. Плата за паветраныя перавозкі і авіяцыйныя работы**

Плата за паветраныя перавозкі ажыццяўляецца на падставе тарыфаў, якія ўстанаўліваюцца пры выкананні ўнутраных паветраных перавозак у адпаведнасці з заканадаўствам, а пры выкананні міжнародных паветраных перавозак – у адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Для асобных катэгорый грамадзян і груп насельніцтва могуць устанаўлівацца льготы па аплаце паветраных перавозак. Пералік асобных катэгорый грамадзян, якія маюць права на льготы па аплаце паветраных перавозак, і парадак пакрыцця выдаткаў авіяцыйным арганізацыям, звязаных з даваннем указаных ільгот, вызначаюцца заканадаўчымі актамі.

Авіяцыйныя арганізацыі маюць права самастойна ўстанаўліваць ільготы для асобных катэгорый грамадзян, расходы па якіх не падлягаюць пакрыццю з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

Парадак аплаты авіяцыйных работ вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 99. Агульныя ўмовы паветранай перавозкі пасажыраў**

Перавозчык, а таксама іншыя ўпаўнаважаныя ім арганізацыі і грамадзяне, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, абавязаны арганізаваць абслугоўванне пасажыраў паветраных суднаў і забяспечыць іх дакладнай і своечасовай інфармацыяй аб руху паветраных суднаў і паслугах, якія аказваюцца.

Пералік паслуг і парадак іх аказання пасажырам паветраных суднаў вызначаюцца авіяцыйнымі правіламі, а таксама правіламі паветраных перавозак, устаноўленымі перавозчыкам.

У выпадку, калі Рэспубліка Беларусь з'яўляецца дзяржавай прызначэння або транзіту, да пачатку міжнароднай паветранай перавозкі пасажыраў перавозчык абавязаны пераканацца ў тым, што пасажыры маюць дакументы, неабходныя для ўезду ў Рэспубліку Беларусь.

Пры ажыццяўленні міжнароднай паветранай перавозкі пасажыраў перавозчык мае права правяраць у пасажыраў дакументы, неабходныя для ўезду ў дзяржаву прызначэння, транзіту.

Пасажыр паветранага судна мае права:

бясплатнага правозу свайго багажу ў выпадках і межах, устаноўленых часткай шостай гэтага артыкула;

бясплатнага правозу дзіцяці, якое едзе разам з ім, ва ўзросце да двух гадоў без давання яму асобнага месца пры выкананні ўнутраных паветраных перавозак, а пры выкананні міжнародных паветраных перавозак – у адпаведнасці з ільготным тарыфам;

правозу дзяцей ва ўзросце ад двух да дванаццаці гадоў у адпаведнасці з ільготным тарыфам;

бясплатнага карыстання паслугамі дадзеных перавозчыкам пакояў адпачынку, маці і дзіцяці і (або) месцаў у гасцініцы ў выпадку перапынення паветранай перавозкі па віне перавозчыка або вымушанай затрымкі адпраўлення паветранага судна.

Дагавор паветранай перавозкі пасажыра можа прадугледжваць норму бясплатнага правозу багажу або не прадугледжваць такую норму (безбагажны тарыф). Нормы бясплатнага правозу багажу, у тым ліку рэчаў, якія знаходзяцца пры пасажыру, устанаўліваюцца перавозчыкам у залежнасці ад тыпу паветранага судна і класа

абслугоўвання, якое даецца пасажыру, і не могуць быць меншымі за дзесяць кілаграмаў на аднаго пасажыра.

Пасажыр паветранага судна абавязаны па патрабаванні перавозчыка, які ажыццяўляе міжнародную паветраную перавозку пасажыраў, прад'яўляць яму дакументы, неабходныя для ўезду ў дзяржаву прызначэння, транзіту.

**Артыкул 100. Адмова перавозчыка ад выканання дагавора паветранай перавозкі пасажыра, дагавора паветранай перавозкі грузу**

Перавозчык мае права ў аднабаковым парадку адмовіцца ад выканання дагавора паветранай перавозкі пасажыра, дагавора паветранай перавозкі грузу ў выпадку:

парушэння пасажырам, грузаадпраўшчыкам пашпартных, мытных, санітарных і іншых патрабаванняў, устаноўленых заканадаўствам і якія тычацца паветранай перавозкі, а пры выкананні міжнароднай паветранай перавозкі – таксама правіл, устаноўленых кампетэнтнымі органамі замежнай дзяржавы, якая з'яўляецца дзяржавай адпраўлення, прызначэння або транзіту, у адпаведнасці з заканадаўствам гэтай дзяржавы;

адмовы пасажыра, грузаадпраўшчыка ад выканання патрабаванняў авіяцыйных правіл;

калі стан здароўя пасажыра паветранага судна пагражае бяспецы самога пасажыра або іншых грамадзян, што пацвярджаецца медыцынскімі дакументамі, або стварае беспарадак і неадольныя нязручнасці для іншых грамадзян;

адмовы пасажыра паветранага судна аплаціць правоз свайго багажу ў памеры і на ўмовах, прадугледжаных дагаворам паветранай перавозкі пасажыра;

адмовы пасажыра паветранага судна аплаціць правоз дзіцяці, якое едзе разам з ім, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных абзацам трэцім часткі пятай артыкула 99 гэтага Кодэкса пры выкананні ўнутранай паветранай перавозкі пасажыраў;

адмовы пасажыра ад надгляду, прад'яўлення для надгляду багажу, у тым ліку рэчаў, якія знаходзяцца пры ім, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам;

парушэння пасажырам паветранага судна ўстаноўленых перавозчыкам правіл паводзін на борце паветранага судна, якое стварае пагрозу для бяспекі палёту паветранага судна або пагрозу для жыцця і (або) здароўя іншых грамадзян, а таксама невыканання пасажырам паветранага судна распараджэнняў і каманд камандзіра паветранага судна, якія падлягаюць абавязковаму выкананню;

наяўнасці ў багажы, у тым ліку ў рэчах, якія знаходзяцца пры пасажыру, а таксама ў грузе забароненых да паветранай перавозкі рэчываў, матэрыялаў і вырабаў;

адмовы пасажыра паветранага судна прад'явіць перавозчыку, які ажыццяўляе міжнародную паветраную перавозку пасажыраў, дакументы, неабходныя для ўезду ў дзяржаву прызначэння, транзіту;

наяўнасці ў перавозчыка, які ажыццяўляе міжнародную паветраную перавозку пасажыраў, звестак аб тым, што пасажыру будзе адмоўлена ва ўездзе ў Рэспубліку Беларусь, калі Рэспубліка Беларусь з'яўляецца дзяржавай прызначэння або транзіту.

калі пасажыр унесены перавозчыкам у рэестр (базу даных) асоб, паветраная перавозка якіх абмежавана перавозчыкам, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткай чацвёртай артыкула $100^1$ гэтага Кодэкса.

У выпадку адмовы перавозчыка ад выканання дагавора паветранай перавозкі пасажыра, дагавора паветранай перавозкі грузу вяртанне пасажыру і грузаадпраўшчыку грашовых сродкаў, выплачаных за паветраную перавозку, ажыццяўляецца ў наступным парадку:

у выпадках, прадугледжаных абзацамі другім, трэцім, пятым, шостым, дзявятым – дванаццатым часткі першай гэтага артыкула, грашовыя сродкі, выплачаныя за

паветраную перавозку, вяртаюцца ў адпаведнасці з умовамі дагавора паветранай перавозкі пасажыра, дагавора паветранай перавозкі грузу;

у выпадку, прадугледжаным абзацам чацвёртым часткі першай гэтага артыкула, пасажыру вяртаюцца грашовыя сродкі, выплачаныя за паветраную перавозку;

у выпадках, прадугледжаных абзацамі сёмым і восьмым часткі першай гэтага артыкула, грашовыя сродкі, выплачаныя за паветраную перавозку, не вяртаюцца.

У выпадку адмовы перавозчыка ад выканання дагавора паветранай перавозкі пасажыра, дагавора паветранай перавозкі грузу, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных абзацам восьмым часткі першай гэтага артыкула, пасажыру, грузаадпраўшчыку вяртаецца сума, заплачаная за паветраную перавозку.

**Артыкул 100[1]. Адмова ў заключэнні дагавора паветранай перавозкі пасажыру, унесенаму перавозчыкам у рэестр (базу даных) асоб, паветраная перавозка якіх абмежавана перавозчыкам**

Перавозчык або асоба, упаўнаважаная перавозчыкам на заключэнне дагавора паветранай перавозкі пасажыра, мае права адмовіць у заключэнні такога дагавора пасажыру, калі ён унесены перавозчыкам у рэестр (базу даных) асоб, паветраная перавозка якіх абмежавана перавозчыкам, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткай чацвёртай гэтага артыкула.

Рашэнне аб унясенні перавозчыкам пасажыра ў рэестр (базу даных) асоб, паветраная перавозка якіх абмежавана перавозчыкам, прымаецца ў выпадку ўчынення пасажырам на борце паветранага судна гэтага перавозчыка адміністрацыйнага правапарушэння, прадугледжанага артыкуламі 18.5 або 19.1 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, альбо злачынства супраць жыцця і здароўя, альбо злачынства, прадугледжанага артыкуламі 311, 321, 339 або 340 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, пасля ўступлення ў законную сілу ў дачыненні да пасажыра пастановы аб накладанні адміністрацыйнага спагнання, прысуду суда.

Копіі пастановы аб накладанні адміністрацыйнага спагнання, прысуду суда, якія ўступілі ў законную сілу ў дачыненні да пасажыра, у пяцідзённы тэрмін падлягаюць накіраванню органам, упаўнаважаным разглядаць справы аб адміністрацыйных правапарушэннях, судом перавозчыку, на борце паветранага судна якога ўчынены адміністрацыйныя правапарушэнні альбо злачынствы, названыя ў частцы другой гэтага артыкула, для прыняцця ім рашэння аб унясенні пасажыра ў рэестр (базу даных) асоб, паветраная перавозка якіх абмежавана перавозчыкам.

У заключэнні дагавора паветранай перавозкі пасажыра не можа быць адмоўлена пасажыру, унесенаму перавозчыкам у рэестр (базу даных) асоб, паветраная перавозка якіх абмежавана перавозчыкам, у выпадках, калі гэты пасажыр:

вяртаецца ў Рэспубліку Беларусь з пункта адпраўлення, паміж якім і Рэспублікай Беларусь адзіным спосабам транспартных зносін з'яўляецца паветраная перавозка;

падлягае дэпартацыі, пры ўмове, што адзіным спосабам транспартных зносін паміж Рэспублікай Беларусь і пунктам адпраўлення або пунктам прызначэння з'яўляецца паветраная перавозка;

накіроўваецца да месца аказання медыцынскай дапамогі або назад, што пацвярджаецца дакументальна;

суправаджае непаўналетняга, інваліда і (або) іншых асоб з абмежаваннямі жыццядзейнасці да месца аказання медыцынскай дапамогі або назад, што пацвярджаецца дакументальна;

накіроўваецца на пахаванне члена сям'і, блізкага сваяка ці назад, што пацвярджаецца дакументальна.

Перавозчык абавязаны ў пісьмовай форме паведаміць пасажыру аб унясенні яго ў рэестр (базу даных) асоб, паветраная перавозка якіх абмежавана перавозчыкам, а таксама пра выпадкі, пры якіх пасажыру не можа быць адмоўлена ў заключэнні дагавора паветранай перавозкі пасажыра.

Парадак стварэння і вядзення рэестра (базы даных) асоб, паветраная перавозка якіх абмежавана перавозчыкам, вызначаецца перавозчыкам.

Перавозчык выключае пасажыра з рэестра (базы даных) асоб, паветраная перавозка якіх абмежавана перавозчыкам, у выпадку:

сканчэння тэрміну, пасля заканчэння якога лічыцца, што асоба не мела адміністрацыйнага спагнання;

пагашэння або зняцця судзімасці;

адмены пастановы аб накладанні адміністрацыйнага спагнання, прысуду суда, якія ўступілі ў законную сілу.

Для выключэння з рэестра (базы даных) асоб, паветраная перавозка якіх абмежавана перавозчыкам, пасажыр або яго прадстаўнік абавязаны падаць перавозчыку выпіску з Адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях са звесткамі аб судзімасці або прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці. Перавозчык у тэрмін да трох рабочых дзён выключае пасажыра з рэестра (базы даных) асоб, паветраная перавозка якіх абмежавана перавозчыкам.

**Артыкул 101. Адмова пасажыра паветранага судна ад выканання дагавора паветранай перавозкі пасажыра**

Пасажыр паветранага судна мае права адмовіцца ад выканання дагавора паветранай перавозкі пасажыра, паведаміўшы аб гэтым перавозчыку не пазней чым за пяць дзён да адпраўлення паветранага судна, і атрымаць назад грашовыя сродкі, заплачаныя за паветраную перавозку, калі іншае не прадугледжана часткай трэцяй гэтага артыкула.

Пры добраахвотнай адмове пасажыра паветранага судна ад выканання дагавора паветранай перавозкі пасажыра па прычынах, не прадугледжаных часткай пятай гэтага артыкула, пазней за тэрмін, устаноўлены часткай першай гэтага артыкула, пасажыр паветранага судна мае права ў парадку і тэрміны, вызначаныя авіяцыйнымі правіламі, атрымаць назад грашовыя сродкі, заплачаныя за паветраную перавозку, з вылічэннем збору, памер якога не можа перавышаць дваццаці пяці працэнтаў ад грашовых сродкаў, заплачаных за паветраную перавозку.

У выпадку, калі дагавор паветранай перавозкі пасажыра заключаны з прымяненнем тарыфаў:

якія не падлягаюць вяртанню пры добраахвотнай адмове пасажыра паветранага судна ад выканання дагавора паветранай перавозкі пасажыра (незваротны тарыф), грашовыя сродкі, заплачаныя за паветраную перавозку, пры добраахвотнай адмове пасажыра паветранага судна ад выканання дагавора паветранай перавозкі пасажыра не вяртаюцца;

якія маюць якія-небудзь абмежаванні ў правілах іх прымянення, грашовыя сродкі, выплачаныя за паветраную перавозку, пры добраахвотнай адмове пасажыра паветранага судна ад выканання дамовы паветранай перавозкі пасажыра вяртаюцца ў адпаведнасці з правіламі прыменепага тарыфу.

Перавозчык абавязаны ў парадку, устаноўленым авіяцыйнымі правіламі, інфармаваць пасажыра паветранага судна аб умовах вяртання або невяртання грашовых сродкаў, заплачаных за паветраную перавозку, да заключэння дагавора паветранай перавозкі пасажыра.

У выпадку вымушанай адмовы пасажыра паветранага судна ад выканання дагавора паветранай перавозкі пасажыра ў сувязі з затрымкай адпраўлення паветранага судна, а таксама ў іншых выпадках вымушанай адмовы, прадугледжаных авіяцыйнымі правіламі, пасажыру паветранага судна вяртаюцца грашовыя сродкі, заплачаныя за паветраную перавозку.

**Артыкул 102. Тэрмін дастаўкі грузу і паштовых адпраўленняў**

Перавозчык абавязаны даставіць прынятыя да паветранай перавозкі груз і паштовыя адпраўленні ў пункт прызначэння ва ўстаноўлены тэрмін.

Тэрмін дастаўкі грузу і паштовых адпраўленняў вызначаецца авіяцыйнымі правіламі або правіламі паветраных перавозак, устаноўленымі перавозчыкам, калі іншае не прадугледжана дагаворам паветранай перавозкі грузу.

**Артыкул 103. Змяненне дагавора паветранай перавозкі грузу**

Грузаадпраўшчык мае права ў парадку, вызначаным авіяцыйнымі правіламі або правіламі паветраных перавозак, устаноўленымі перавозчыкам, атрымаць назад здадзены да паветранай перавозкі груз да яго адпраўлення, унесці змяненні ў грузавую накладную ў адносінах да грузаатрымальніка да выдачы грузу грузаатрымальніку або асобе, упаўнаважанай на атрыманне грузу, распарадзіцца ў выпадку непрыняцця яго грузаатрымальнікам або немагчымасці выдачы.

У выпадку змянення ўмоў паветранай перавозкі грузу, прадугледжаных дагаворам паветранай перавозкі грузу, перавозчык абавязаны паведаміць аб гэтым грузаадпраўшчыку і грузаатрымальніку ў парадку, вызначаным авіяцыйнымі правіламі або правіламі паветраных перавозак, устаноўленымі перавозчыкам.

**Артыкул 104. Атрыманне грузу ў пункце прызначэння**

Перавозчык абавязаны паведаміць грузаатрымальніку аб прыбыцці грузу ў тэрмін і парадку, вызначаныя авіяцыйнымі правіламі або правіламі паветраных перавозак, устаноўленымі перавозчыкам, калі іншае не прадугледжана дагаворам паветранай перавозкі грузу.

Грузаатрымальнік абавязаны прыняць і вывезці груз у тэрмін, вызначаны авіяцыйнымі правіламі або правіламі паветраных перавозак, устаноўленымі перавозчыкам, калі іншае не прадугледжана дагаворам паветранай перавозкі грузу.

Грузаатрымальнік мае права адмовіцца ад атрымання пашкоджанага або сапсаванага грузу, калі будзе выяўлена, што якасць грузу змянілася настолькі, што выключаецца магчымасць поўнага або частковага яго выкарыстання ў адпаведнасці з першапачатковым прызначэннем.

**Артыкул 105. Неатрыманне грузу**

Калі грузаатрымальнік не запатрабаваў груз, які прыбыў, у тэрмін, вызначаны авіяцыйнымі правіламі або правіламі паветраных перавозак, устаноўленымі перавозчыкам, або дагаворам паветранай перавозкі грузу, або адмовіўся ад яго прыёму, перавозчык абавязаны паведаміць аб гэтым грузаадпраўшчыку, пакінуць груз у сябе на захоўванне за кошт сродкаў грузаадпраўшчыка і на яго рызыку.

Груз, не атрыманы на працягу тэрміну, вызначанага авіяцыйнымі правіламі або правіламі паветраных перавозак, устаноўленымі перавозчыкам, або дагаворам

паветранай перавозкі грузу, лічыцца незапатрабаваным і рэалізуецца ў парадку, вызначаным авіяцыйнымі правіламі.

Захоўванне грузу, які падлягае мытнаму кантролю, і распараджэнне ім ажыццяўляюцца ў парадку, устаноўленым у адпаведнасці з міжнароднымі дамовамі Рэспублікі Беларусь, іншымі міжнароднымі дагаворамі і актамі, што складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза, якія рэгулююць мытныя праваадносіны, і заканадаўствам аб мытным рэгуляванні.

**Артыкул 106. Паветраная перавозка небяспечных грузаў**

Паветраная перавозка зброі, боепрыпасаў, выбуховых, атрутных, лёгкаўзгаральных, радыеактыўных рэчываў, а таксама іншых небяспечных рэчываў, матэрыялаў і вырабаў выконваецца ў адпаведнасці з заканадаўствам, а таксама міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь і авіяцыйнымі правіламі.

## ГЛАВА 15
## АВІЯЦЫЙНЫЯ РАБОТЫ

**Артыкул 107. Выкананне авіяцыйных работ**

Парадак выканання авіяцыйных работ устанаўліваецца авіяцыйнымі правіламі.

Віды авіяцыйных работ у галіне грамадзянскай і эксперыментальнай авіяцыі ўстанаўліваюцца авіяцыйнымі правіламі.

**Артыкул 108. Дагавор на выкананне авіяцыйных работ**

Паводле дагавора на выкананне авіяцыйных работ падрадчык (эксплуатант паветранага судна) абавязваецца выканаць для заказчыка авіяцыйныя работы ў парадку, тэрміны, аб'ёме і на ўмовах, прадугледжаных гэтым дагаворам. Заказчык абавязваецца даць падрадчыку (эксплуатанту паветранага судна) прадугледжаны дагаворам аб'ём авіяцыйных работ ва ўстаноўленыя тэрміны і аплаціць іх выкананне.

Дагаворам на выкананне авіяцыйных работ павінны быць таксама прадугледжаны:

парадак выкарыстання і падтрымання ў эксплуатацыйным стане аэрадромаў (вертадромаў), пасадачных пляцовак і іх абсталявання;

стварэнне неабходных умоў для адпачынку членаў экіпажаў паветраных суднаў, аператараў беспілотных лятальных апаратаў;

іншыя ўмовы забеспячэння выканання авіяцыйных работ зыходзячы з іх асаблівасцей, у тым ліку патрабавання па ахове навакольнага асяроддзя.

Плата за выкананне авіяцыйных работ устанаўліваецца пагадненнем бакоў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

**Артыкул 109. Выкананне авіяцыйных работ эксплуатантамі паветраных суднаў Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі замежнай дзяржавы**

Авіяцыйныя работы на тэрыторыі замежнай дзяржавы могуць выконвацца эксплуатантамі паветраных суднаў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з заканадаўствам гэтай замежнай дзяржавы і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 16
## АДКАЗНАСЦЬ ПЕРАВОЗЧЫКА, ЭКСПЛУАТАНТА ПАВЕТРАНАГА СУДНА І ГРУЗААДПРАЎШЧЫКА

**Артыкул 110. Агульныя прынцыпы адказнасці**

Перавозчык нясе адказнасць перад пасажырам паветранага судна, грузаадпраўшчыкам, грузаатрымальнікам у парадку, устаноўленым заканадаўствам, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, а таксама дагаворам паветранай перавозкі пасажыра і дагаворам паветранай перавозкі грузу.

Эксплуатант паветранага судна абавязаны кампенсаваць шкоду, прычыненую пры эксплуатацыі паветранага судна, калі не дакажа, што шкода ўзнікла з прычыны непераадольнай сілы або намеру пацярпелага.

**Артыкул 111. Адказнасць перавозчыка за прычыненне шкоды жыццю або здароўю пасажыра паветранага судна**

Адказнасць перавозчыка за шкоду, прычыненую пры выкананні паветранай перавозкі пасажыра жыццю або здароўю пасажыра паветранага судна, вызначаецца ў адпаведнасці з палажэннямі главы 58 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, калі дагаворам паветранай перавозкі пасажыра не прадугледжаны больш высокі памер адказнасці перавозчыка.

У мэтах гэтага артыкула паветраная перавозка пасажыра ўключае ў сябе перыяд з моманту праходжання пасажырам паветранага судна перадпалётнага надгляду і да моманту, калі пасажыр паветранага судна ў суправаджэнні ўпаўнаважаных перавозчыкам асоб пакінуў зону аэрадрома (вертадрома), якая кантралюецца.

**Артыкул 112. Адказнасць перавозчыка за страту, недастачу або пашкоджанне (псуту) багажу, грузу, а таксама рэчаў, якія знаходзяцца пры пасажыру**

Перавозчык нясе адказнасць за незахаванасць багажу або грузу, якая адбылася пасля прыняцця іх да паветранай перавозкі і да выдачы пасажыру або ўпаўнаважанай ім асобе, грузаатрымальніку або асобе, упаўнаважанай на атрыманне грузу, калі не дакажа, што страта, недастача або пашкоджанне (псута) багажу або грузу адбыліся з прычыны абставін, якія перавозчык не мог прадухіліць і ліквідацыя якіх ад яго не залежала.

Перавозчык нясе адказнасць за незахаванасць рэчаў, якія знаходзяцца пры пасажыру, калі не дакажа, што страта, недастача або пашкоджанне (псута) гэтых рэчаў адбыліся з прычыны абставін, якія перавозчык не мог прадухіліць і ліквідацыя якіх ад яго не залежала, або намеру пасажыра.

**Артыкул 113. Памер адказнасці перавозчыка за страту, недастачу або пашкоджанне (псуту) багажу, грузу, а таксама рэчаў, якія знаходзяцца пры пасажыру**

Перавозчык нясе адказнасць за страту, недастачу або пашкоджанне (псуту), якія адбыліся па яго віне, багажу, грузу, а таксама рэчаў, якія знаходзяцца пры пасажыру, у наступных памерах:

за страту, недастачу або пашкоджанне (псуту) багажу, грузу, прынятых да паветранай перавозкі з аб’яўленнем каштоўнасці, – у памеры аб'яўленай каштоўнасці;

за страту, недастачу або пашкоджанне (псуту) багажу, грузу, прынятых да паветранай перавозкі без аб’яўлення каштоўнасці, – у памеры іх кошту;

за страту, недастачу або пашкоджанне (псуту) рэчаў, якія знаходзяцца пры пасажыру, – у памеры іх кошту, а ў выпадку немагчымасці яго ўстанаўлення – у памеры, не большым за дзесяць базавых велічынь, устаноўленых заканадаўствам.

За паветраную перавозку багажу або грузу з аб'яўленай каштоўнасцю з грузаадпраўшчыка або грузаатрымальніка збіраецца дадатковая плата, памер якой устанаўліваецца дагаворам паветранай перавозкі пасажыра або дагаворам паветранай перавозкі грузу.

Кошт багажу, грузу, а таксама рэчаў, якія знаходзяцца пры пасажыру, вызначаецца зыходзячы з кошту, указанага ў рахунку прадаўца або прадугледжанага дагаворам паветранай перавозкі пасажыра, дагаворам паветранай перавозкі грузу, а пры яго адсутнасці – зыходзячы з сярэдняга кошту на аналагічны тавар, які існаваў у тым месцы, у якім груз падлягаў выдачы, у дзень добраахвотнага задавальнення такога патрабавання або ў дзень вынясення судовага рашэння, калі патрабаванне добраахвотна не было задаволена.

За страту, недастачу або пашкоджанне (псуту) багажу, грузу, а таксама рэчаў, якія знаходзяцца пры пасажыру, пры выкананні міжнародных паветраных перавозак перавозчык нясе адказнасць у адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 114. Выключаны**

**Артыкул 115. Адказнасць грузаадпраўшчыка**

Грузаадпраўшчык нясе адказнасць за шкоду, прычыненую перавозчыкам трэцім асобам, а таксама самому перавозчыку з прычыны недакладнасці або непаўнаты звестак, прадстаўленых грузаадпраўшчыкам.

**Артыкул 116. Адказнасць перавозчыка за страту, пашкоджанне (псуту), недастачу або пратэрміноўванне дастаўкі паштовых адпраўленняў**

Перавозчык нясе матэрыяльную адказнасць перад аператарамі паштовай сувязі за страту, пашкоджанне (псуту), недастачу або пратэрміноўванне дастаўкі паштовых адпраўленняў у адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 117. Пагадненні аб павышэнні адказнасці перавозчыка**

Перавозчык мае права заключаць пагадненні з пасажырамі, грузаадпраўшчыкамі або грузаатрымальнікамі аб павышэнні сваёй адказнасці ў параўнанні з адказнасцю, устаноўленай гэтым Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 17
## ПРЭТЭНЗІІ І ІСКІ

**Артыкул 118. Камерцыйныя і іншыя акты**

Абставіны, якія могуць з'яўляцца падставай для маёмаснай адказнасці перавозчыка, грузаадпраўшчыка, грузаатрымальніка і пасажыра, сведчацца камерцыйнымі актамі, актамі-паведамленнямі або актамі агульнай формы.

На тэрыторыі замежнай дзяржавы абставіны, указаныя ў частцы першай гэтага артыкула, сведчацца ў адпаведнасці з правіламі, якія дзейнічаюць у гэтай дзяржаве.

Камерцыйны акт складаецца для пасведчання:

неадпаведнасці фактычных наймення, масы і колькасці месцаў багажу, грузу даным, указаным у перавозачным дакуменце;

знаходжання багажу або грузу без дакументаў або дакументаў без багажу або грузу;

вяртання перавозчыку выкрадзенага багажу або грузу.

Формы камерцыйных актаў, актаў-паведамленняў, актаў агульнай формы, а таксама парадак іх стварэння і пасведчання абставін, якія не патрабуюць складання такіх актаў, вызначаюцца авіяцыйнымі правіламі.

**Артыкул 119. Прэтэнзіі да перавозчыка, якія вынікаюць з паветранай перавозкі грузу**

Грузаадпраўшчык або грузаатрымальнік абавязаны прад'явіць да перавозчыка прэтэнзію ў пісьмовай форме да прад'яўлення яму іску, які вынікае з паветранай перавозкі грузу.

Тэрміны прад'яўлення прэтэнзій да перавозчыка, якія вынікаюць з паветранай перавозкі грузу, вызначаюцца авіяцыйнымі правіламі.

Прэтэнзіі прад'яўляюцца да перавозчыка, які выконваў паветраную перавозку грузу або абавязаны быў яе выканаць у адпаведнасці з пагадненнем бакоў.

Прэтэнзіі, якія вынікаюць з перавозкі грузу ў змяшаным паведамленні, прад'яўляюцца да перавозчыка, які даставіў груз у канчатковы пункт перавозкі.

**Артыкул 120. Права на прад'яўленне прэтэнзій і (або) іскаў**

Права на прад'яўленне прэтэнзій і (або) іскаў маюць:

фрахтавальнік, грузаадпраўшчык або пасажыр – у выпадку непадачы паветранага судна або падачы яго са спазненнем;

грузаатрымальнік або грузаадпраўшчык – у выпадку страты грузу;

грузаатрымальнік – у выпадку недастачы, пашкоджання (псуты), пратэрміноўвання ў дастаўцы або затрымкі выдачы грузу;

прад'яўнік багажнай квітанцыі – у выпадку страты, недастачы, пашкоджання (псуты) багажу або пратэрміноўвання ў яго дастаўцы;

фрахтавальнік, грузаадпраўшчык, грузаатрымальнік або пасажыр – у выпадку спагнання правазных выплат у завышаным памеры;

дзяржаўныя органы, арганізацыі і грамадзяне ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 121. Перадача права на прад'яўленне прэтэнзій і іскаў**

Перадача права на прад'яўленне прэтэнзій і іскаў да іншых арганізацый або грамадзян не дапускаецца, за выключэннем выпадкаў перадачы такога права грузаадпраўшчыкам і грузаатрымальнікам адзін аднаму, а таксама экспедытару.

**Артыкул 122. Тэрміны разгляду прэтэнзій**

Прэтэнзіі грузаадпраўшчыка, грузаатрымальніка або фрахтавальніка, якія вынікаюць з паветранай перавозкі грузу, разглядаюцца перавозчыкам на працягу трыццаці дзён з дня атрымання прэтэнзій. Па сканчэнні ўказанага тэрміну перавозчык абавязаны паведаміць заяўніку аб поўным або частковым задавальненні або адхіленні прэтэнзіі. Парадак паведамлення заяўніку вызначаецца авіяцыйнымі правіламі.

**Артыкул 123. Тэрмін іскавай даўнасці**

Тэрмін іскавай даўнасці па патрабаваннях, якія вынікаюць з паветранай перавозкі грузу, складае адзін год з моманту, які вызначаецца ў адпаведнасці з авіяцыйнымі правіламі.

## ГЛАВА 18 ВЫКЛЮЧАНА

**Артыкул 124. Выключаны**

**Артыкул 125. Выключаны**

## ГЛАВА 19
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 126. Страціў сілу**

**Артыкул 127. Прызнанне, што Паветраны кодэкс Рэспублікі Беларусь і артыкул 16 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь» страцілі сілу**

У сувязі з прыняццем гэтага Кодэкса прызнаць, што страцілі сілу:

Паветраны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 11 студзеня 1999 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 5, 2/15);

артыкул 16 Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2003 года «Аб унясенні змяненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 8, 2/932).

**Артыкул 128. Уступленне ў сілу гэтага Кодэкса**

Гэты Кодэкс уступае ў сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Артыкул 129. Меры для рэалізацыі палажэнняў гэтага Кодэкса**

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у шасцімесячны тэрмін пасля ўступлення ў сілу гэтага Кодэкса:

прывесці рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Кодэксам;

забяспечыць перагляд і прызнанне страціўшымі сілу рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, падпарадкаванымі Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, іх нарматыўных прававых актаў, якія супярэчаць гэтаму Кодэксу;

прыняць іншыя меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Кодэкса.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** **А. Лукашэнка**